ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена



«Славянскія акцэнты» Гроса



Каму патрэбен рэпетытар?



Новае амплуа для каня

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 113 (28223) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## Пяцігодка добрых спраў

**Учора Прэзідэнт падпісаў Указ «Аб занясенні на Рэспубліканскую дошку Гонару пераможцаў спаборніцтваў за 2011—2015 гады і 2015 год». Для прадпрыемстваў, устаноў і цэлых рэгіёнаў гэта не толькі прызнанне на вышэйшым узроўні іх поспехаў у развіцці і руху наперад, але яшчэ і адказнасць, і абяцанне з іх боку, што развіццё і рух наперад не спыняцца. Для астатніх — гэта і мэта, на дасягненне якой варта працаваць, і добры прыклад, як гэта рабіць, і каштоўны досвед, якім могуць падзяліцца пераможцы... Для ўсёй краіны — важная падзея ў важны для яе час.**

### Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь




## АБ ЗАНЯСЕННІ НА РЭСПУБЛІКАНСКУЮ ДОШКУ ГОНАРУ ПЕРАМОЖЦАЎ СПАБОРНІЦТВАЎ ЗА 2011—2015 ГАДЫ І 2015 ГОД

1. Прызнаць пераможцамі спаборніцтва сярод абласцей і г.Мінска за дасягненне ў 2011—2015 гадах найлепшых вынікаў у выкананні асноўных паказчыкаў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця і занесці на Рэспубліканскую дошку Гонару Мінскую, Віцебскую і Гродзенскую вобласці.

2. Прызнаць пераможцамі спаборніцтва і занесці на Рэспубліканскую дошку Гонару за дасягненне ў 2015 годзе найлепшых паказчыкаў:

2.1. у сферы сацыяльна-эканамічнага развіцця:

— сярод раёнаў — Нясвіжскі раён Мінскай вобласці, Мазырскі раён Гомельскай вобласці, Талачынскі раён Віцебскай вобласці;

— сярод гарадоў і раёнаў у гарадах — Першамайскі раён г. Мінска, г. Наваполацк Віцебскай вобласці, г. Гродна;

— сярод арганізацый прамысловасці:

падпарадкаваных рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, якія ўваходзяць у склад іншых дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь, або ў якіх гэтыя органы (арганізацыі) ажыццяўляюць кіраванне акцыямі (долямі ў статутных фондах), — адкрытае акцыянернае таварыства «Гомельскі радыёзавод», адкрытае акцыянернае таварыства «Брэсцкі панчошны камбінат»;

падпарадкаваных мясцовым Саветам дэпутатаў, выканаўчым і распарадчым органам або ў якіх яны ажыццяўляюць кіраванне акцыямі (долямі ў статутных фондах), — адкрытае акцыянернае таварыства «Ляхавіцкі льнозавод», адкрытае акцыянернае таварыства «Пружанскі льнозавод»;

без ведамаснай падпарадкаванасці — таварыства з абмежаванай адказнасцю «Полімайстар», замежнае таварыства з абмежаванай адказнасцю «ВМГ Індустры»;

— сярод арганізацый, якія ажыццяўляюць дзейнасць у будаўніцтве, — адкрытае акцыянернае таварыства «Дарожна-будаўнічы трэст № 3», адкрытае акцыянернае таварыства «Гроднапрамбуд», адкрытае акцыянернае таварыства «Мазырскі домабудаўнічы камбінат»;

— сярод арганізацый сельскай гаспадаркі — сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў «Узыходзячая зара», камунальнае сельскагаспадарчае ўнітарнае прадпрыемства «Саўгаскамбінат «Зара», сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў «Свіцязянка-2003», камунальнае сельскагаспадарчае ўнітарнае прадпрыемства «Эліт-Агра Больцінікі», сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў «Гарадзея»;

— сярод арганізацый лясной гаспадаркі — Мінскае дзяржаўнае вытворчае лесагаспадарчае аб'яднанне, дзяржаўная лесагаспадарчая ўстанова «Аршанскі лясгас»;

СТАР. 2

■ Сезон!

# Смак і водар сапраўднага лета



Фота БЕЛТА.

Вось і дачакаліся! Учора ўпершыню ўбачыў і, вядома ж, пакаштаваў менавіта сакавітыя велізарныя клубніцы! Ды ці толькі я адзін! Да прадаўцоў ягад выстройваліся чэргі, і кожны пакупнік адыходзіў ад прылаўка з ладным пакетам (а то і не адным) цёмна-чырвонага смакоцця. Нават у транспарце лунаў гэты непаўторны і такі доўгачаканы водар... У прыватнасці, масава пайшла прадукцыя з клубнічнага краю Беларусі — Лунінеччыны. Хто не чуў пра тамтэйшы знакаміты кірмаш у Дварцы, адкуль і вязуць пастаўшчыкі салодкую ягаду як па ўсёй краіне, так і за яе межы?! Думаю, не памылюся, калі назаву клубніцы сапраўдным сімвалам лета. Вядома, потым будуць і іншыя прысмакі, але ж менавіта яны сімвалізуюць, што лета прыйшло — канчаткова і беспаваротна! І мы верым, што яно будзе такім жа яркім на ўражанні, як колер клубніц, такім жа «смачным» на новыя знаёмствы, як іх водар, такім жа карысным для цела і душы, як і спажыўныя ўласцівасці ягады! Клубніцы — гэта пачатак новага невялікага жыцця. Дзякуй, лета, малайца, за ягады з Дварца!

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Леанід АНФІМАЎ, старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю:**

*«Свае грошы трэба паважаць. Паспрабуйце сёння прыйсці на рынак у якой-небудзь іншай краіне і купіць нешта за долары. У вас іх не прымуць. Хоць бы нават у Расіі — папросяць расійскія рублі. Мне хочацца, каб наш рубель быў менавіта такім. Калі правядзём дэнамінацыю, ён стане больш моцным, стане грашыма, які будуць паважаць. Ды і само насельніцтва стане інакш ставіцца да роднай валюты. Калі ацэньваюць стан любой эканомікі, глядзяць на стабільнасць грашовай сістэмы, нацыянальнай валюты і праз яе прызму вызначаюць, ці давяраць такой эканоміцы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.06.2016 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 20047,00 ▲ |
| Еўра | 22488,00 ▼ |
| Рас. руб. | 304,00 ▲ |
| Укр. грыўня | 805,10 ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# «Цэнтральны» статус абавязвае

## Прэзідэнт адзначае добрую дынаміку сацыяльна-эканамічнага развіцця Мінскай вобласці

**Міншчына стала пераможцам сярод усіх рэгіёнаў па выніках сацыяльна-эканамічнага развіцця ў 2011—2015 гадах. Пра гэта ішла гаворка падчас даклада кіраўніку дзяржавы старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Сямёна Шапіры.**

«Для мяне было прыемным здзіўленнем, што, аказваецца, Мінская вобласць заняла першае месца па выніках пяцігодкі. Дынаміка добрая, дай Бог, каб так было», — сказаў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што добрае ўражанне ў яго склалася ў тым ліку ад убачанага падчас аблётаў цэлага шэрагу раёнаў Мінскай вобласці. «Вы папрацавалі вельмі сур'ёзна. Але не трэба забываць, што ёсць у вас яшчэ і праблемныя раёны. Іх трэба даводзіць да розуму, каб узровень земляробства і іншых пытанняў быў такім жа», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама чакае ад Мінаблвыканкама рашэння шэрагу праблемных пытанняў з развіццём інфраструктуры ў аграгарадках паблізу Мінска. «Перш за ўсё, застарэлая праблема Калодзішчаў. Перспектыўнае месца, людзі там будуюцца, хочуць там жыць. Ды і ў любой сёння вёсцы ў Мінскім раёне і не толькі ідзе будаўніцтва. Трэба наводзіць парадак, даваць людзям участкі. Хай будуюцца, укладваюць свае сродкі», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Яшчэ адно даручэнне датычылася прапрацоўкі пытання аб тым, як забяспечыць далейшае выкарыстанне тэрыторый у Мінскай вобласці, дзе размешчаны піянерскія лагеры і базы адпачынку, якія пустуюць.

Не засталіся ў баку і праблемныя пытанні ў сферы бізнесу і работы з інвестарамі, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Аляксандр Лукашэнка падтрымаў прапанову аб тым, каб часова замарозіць штрафныя санкцыі для шэрагу інвестараў, якія ў сілу аб'ектыўных прычын не змаглі ў тэрмін дабудаваць пачатыя аб'екты. «Але хацелася б, каб мы, вызваляючы іх ад санкцый па нявыкананых абавязацельствах, не зрабілі гэта нормай», — заўважыў Прэзідэнт.

Падчас рабочай сустрэчы было ўзнята яшчэ адно пытанне пра невыкананне інвестарамі сваіх абавязацельстваў. «Мы калісьці перадалі інвестарам гаспадарчыя аб'екты — калгасы, саўгасы — а нешта там не атрымалася, і яны, танна атрымаўшы ўласнасць, пачынаюць перапрадаваць ужо ўтрая даражэй па так званай рыначнай цане. Гэта непарадак. Гэта не проста трэба спыніць зараз, а зрабіць так, каб вярнулі назад. Я вас тут абсалютна падтрымліваю», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да Сямёна Шапіры.

Кіраўнік дзяржавы таксама даў шэраг іншых даручэнняў па пытаннях эфектыўнага выкарыстання і меліярацыі зямель у Мінскай вобласці.

# ДАРОГУ АДОЛЬВАЕ ТОЙ, ХТО ІДЗЕ




## Якія пытанні дэлегаты вынесуць на абмеркаванне V Усебеларускага народнага сходу?



**Уладзімір РАДЗЕВІЧ, кіраўнік сялянска-фермерскай гаспадаркі «Сула» Стаўбцоўскага раёна:**

— Лічу, што ў краіне створаны ўмовы для развіцця сялянскіх фермерскіх гаспадарак нароўні з буйнымі дзяржаўнымі сельгаспрадпрыемствамі. Гэта выдзяленне льготных крэдытаў, угнаенняў, тэхнікі па лізінгу, гарантыі раённых выканаўчых камітэтаў пры атрыманні банкаўскіх крэдытаў. Але ёсць і праблемы, якія трэба рашаць. Перш за ўсё, выдзяленне зямлі для вытворчасці — як новым, так і даўно дзеючым фермерам. Сёння няма вызначаных схем, крытэрыяў, па якіх павінна прымацца нарэшце гэтага рашэнне. Часам ад падачы заявы да атрымання акта землекарыстання праходзіць да шасці месяцаў да двух гадоў. Калі фермерскім гаспадаркам, якія маюць багаты вопыт работы і дасягнулі пэўных вынікаў, набыць зямлю не так праблематычна, то пачаткоўцам, якія толькі спрабуюць сябе ў гэтым няпростым бізнесе, значна цяжэй. <u>На маю думку, неабходна прыняць адзіную ацэнку эфектыўнасці гаспадарання на зямлі. Гэта павінны быць падаткі, выплачаныя дзяржаве ў пераліку на адзін гектар выкарыстання зямлі</u>. Пры параўнанні гэтага паказчыка будзе відаць: варта даць канкрэтнай фермерскай гаспадарцы зямлю ці, наадварот, забраць.

Што тычыцца кадраў для сельскай гаспадаркі, то іх трэба выхоўваць з маленства. Дапаможа ранняя прафарыентацыя, мастацкія фільмы, публікацыі на старонках газет, перадачы на радыё і тэлебачанні аб аграрыях, моцных гаспадарніках на зямлі. Кіраўнікі, спецыялісты павінны часцей бываць у школах, каб дапамагчы моладзі вызначыцца з выбарам будучай прафесіі. І яшчэ. У замежных камандзіроўках часта заходжу ў дзіцячыя магазіны і магу канстатаваць, што палова цацак там звязана з сельскай гаспадаркай: трактары, камбайны, плугі, фігуркі жывёл, па якіх можна вызначыць пароду. А ў нас, як правіла, дзецям прапаноўваюцца нейкія трансформеры, Чалавек-павук і героі «Зорных войнаў».

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*



**Дырэктар ААТ «Відамлянскае» Камянецкага раёна Міхаіл СТРАПКО:**

— Я буду ўдзельнічаць ва Усебеларускім народным сходзе ўжо чацвёрты раз. І адчуваю вялікую адказнасць за давер землякоў.

Пачынаў я свой працоўны шлях аграрыя ў знакамітым калгасе «Савецкая Беларусь», шмат чаму навучыўся ў двойчы Героя Сацыялістычнай Працы Уладзіміра Бядулі. А цяпер і сам стараюся падтрымліваць кіраўнікоў-пачаткоўцаў у якасці старшыні Брэсцкага абласнога аграпрамыслоўага саюза. Ужо разам з імі спрачаемся, думаем, абмяркоўваем далейшыя шляхі развіцця сельскай гаспадаркі.

Нядаўна на адным з пасяджэнняў гаворка зайшла пра аграгарадкі. Дарэчы, праграму развіцця вёскі і абуладкавання аграгарадкоў упершыню агучылі таксама на Усебеларускім народным сходзе. Некаторыя тады не верылі, даводзілася сутыкацца са скептыцызмам на гэтую тэму. Але ж змаглі! Прывялі ў парадак цэнтральныя сядзібы, правялі ў вёску водаправод, газ. Словам, умовы для пражывання чалавека сталі цалкам набліжаныя да гарадскіх.

А хіба не падстава ганарыцца сёння прадукцыяй аграрнага сектара? Менавіта з нашай сыравіны малакаперапрацоўчыя прадпрыемствы краіны выпускаюць прадукцыю, якая заваёўвае вышэйшыя адзнакі якасці як у блізкім, так і ў далёкім замежжы. Значыць, не дарэмна ўкладвалі сродкі ў галіну.

Вядома, у сельскай гаспадарцы застаецца шмат праблем. Каб яны паспяхова вырашаліся, неабходна, каб дзяржаўная падтрымка галіны захавалася хоць бы ў цяперашнім выглядзе. <u>А сістэма крэдытавання сельгаспрадпрыемстваў мусіць развівацца далей. Гэта адно з ключавых пытанняў сённяшняга дня</u>. Аграрная вытворчасць мае сезонны характар. І добра было б, каб земляробы атрымалі магчымасць разлічвацца за банкаўскія крэдыты пасля збору і рэалізацыі ўраджаю. Гэту тэму маю намер падрабязна абмеркаваць з калегамі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

# АБ ЗАНЯСЕННІ НА РЭСПУБЛІКАНСКУЮ ДОШКУ ГОНАРУ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— сярод арганізацый сферы паслуг, у тым ліку:

арганізацый гандлю — Бабруйскае адкрытае акцыянернае таварыства «Прамгандаль», адкрытае акцыянернае таварыства «ЦУМ Мінск», адкрытае акцыянернае таварыства «Тытуньвінгандаль», гандлёвае ўнітарнае прадпрыемства «Санта рытэйл»;

арганізацый сувязі і іх філіялаў — Мінскі філіял рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства электрасувязі «Белтэлекам», Гродзенскі філіял рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства электрасувязі «Белтэлекам»;

арганізацый транспарту — таварыства з абмежаванай адказнасцю «Белтранскансалт», камунальнае транспартнае ўнітарнае прадпрыемства «Мінскі метрапалітэн»;

арганізацый адукацыі — установа адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны гандлёва-тэхналагічны каледж», установа адукацыі «Мінскі дзяржаўны абласны ліцэй», дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа № 73 г. Мінска», установа адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга прафесійны агралесатэхнічны каледж імя К.П. Арлоўскага», установа адукацыі «Слуцкі дзяржаўны каледж»;

арганізацый, якія прадстаўляюць паслугі рэстаранаў, бараў, сталовых і індывідуальныя паслугі, — таварыства з абмежаванай адказнасцю «Новы альянс», адкрытае акцыянернае таварыства «Камбінат школьнага харчавання», адкрытае акцыянернае таварыства «Аб'яднанне «Лотас», адкрытае акцыянернае таварыства «Хімчыстка і мыццё бялізны»;

арганізацый, якія ажыццяўляюць дзейнасць у галіне культуры, па арганізацыі адпачынку і забаў, — дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», установа «Гомельскі абласны музей ваеннай славы»;

арганізацый у галіне аховы здароўя — установа аховы здароўя «Бешанковіцкая цэнтральная раённая бальніца», установа аховы здароўя «10-я гарадская клінічная бальніца» (г. Мінск), установа аховы здароўя «Магілёўская абласная дзіцячая бальніца»;

арганізацый у галіне фізічнай культуры і спорту — дзяржаўная ўстанова «Шматпрофільны культурна-спартыўны комплекс «Мінск-арэна»;

арганізацый, якія ажыццяўляюць навуковыя даследаванні і распрацоўкі, — установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі», Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут мікрабіялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», дзяржаўная ўстанова «Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр «Маці і дзіця» Міністэрства аховы здароўя;

2.2. па эканоміі рэсурсаў:

— сярод абласцей і г. Мінска — Мінскую і Магілёўскую вобласці;

— сярод раёнаў — Жыткавіцкі раён Гомельскай вобласці, Нясвіжскі раён Мінскай вобласці, Докшыцкі раён Віцебскай вобласці;

— сярод гарадоў і раёнаў у гарадах — Савецкі раён г. Мінска;

— сярод арганізацый прамысловасці:

падпарадкаваных рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, якія ўваходзяць у склад іншых дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь, або ў якіх гэтыя органы (арганізацыі) ажыццяўляюць кіраванне акцыямі (долямі ў статутных фондах), — адкрытае акцыянернае таварыства «140-ы рамонтны завод», адкрытае акцыянернае таварыства «Беларускабель» (г. Мазыр);

падпарадкаваных мясцовым Саветам дэпутатаў, выканаўчым і распарадчым органам або ў якіх яны ажыццяўляюць кіраванне акцыямі (долямі ў статутных фондах), — адкрытае акцыянернае таварыства «Верхнядзвінскі льнозавод»;

без ведамаснай падпарадкаванасці — вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Цветліт» грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства глухіх»;

— сярод арганізацый, якія ажыццяўляюць дзейнасць у будаўніцтве, — адкрытае акцыянернае таварыства «Дарожна-будаўнічы трэст № 3», адкрытае акцыянернае таварыства «Гроднапрамбуд»;

— сярод арганізацый сельскай гаспадаркі — адкрытае акцыянернае таварыства «Ігнацічы», адкрытае акцыянернае таварыства «Зорка»;

— сярод арганізацый лясной гаспадаркі — дзяржаўная лесагаспадарчая ўстанова «Ваўкавыскі лясгас», дзяржаўная лесагаспадарчая ўстанова «Лоеўскі лясгас»;

— сярод арганізацый сферы паслуг, у тым ліку:

арганізацый сувязі і іх філіялаў — філіял «Міжгародняя сувязь» рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства электрасувязі «Белтэлекам»;

арганізацый транспарту — будаўніча-мантажнае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белтрансаўтаматыка» Беларускай чыгункі.

3. Кіраўніцтву справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь да 21 чэрвеня 2016 г. абнавіць Рэспубліканскую дошку Гонару.

4. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь правесці афіцыйнае адкрыццё абноўленай Рэспубліканскай дошкі Гонару напярэдадні правядзення пятага Усебеларускага народнага сходу.

5. Міністэрству інфармацыі, Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі шырока асвятляць у сродках масавай інфармацыі вопыт работы пераможцаў спаборніцтва, занесеных на Рэспубліканскую дошку Гонару.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.**

■ З нагоды

# НЕ ПРОСТА ЦУД — СІМВАЛ СТАЛІЦЫ



## Занясенне на Рэспубліканскую дошку Гонару стала прыемнай навіной для калектыву Нацыянальнай бібліятэкі акурат напярэдадні свята — сёння якраз дзесяць гадоў, як расчыніў свае дзверы яе новы будынак

**Сёння складана ўявіць Мінск без «дыямента ведаў» — бібліятэкі, чыя «кватэра» за гэты час ужо паспела ператварыцца ў сапраўдны брэнд горада. «Нацыяналка» сустракае гасцей і мінчан, дае магчымасць з агляднай пляцоўкі зірнуць на сталіцу з вышыні птушынага палёту, яе дзверы заўсёды адчыненыя для студэнтаў, прафесійных даследчыкаў і проста цікаўных чытачоў. Тут вас гасцінна прывітаюць на шматлікіх выстаўках, прэзентацыях, фестывалях.**

Зрэшты, Нацыянальная бібліятэка Беларусі — гэта не проста сховішча кніг і інфармацыйных рэсурсаў. Гэта сацыякультурны, метадычны цэнтр, які, разам з самім будынкам вырас, пасталеў і развіўся ў сапраўды ўнікальную ўстанову.

— Сёння ў адпаведнасці са сваёй місіяй наша бібліятэка вырашае як традыцыйныя задачы захавання культурнай дакументальнай спадчыны, так і новыя — стварэнне электроннай бібліятэкі, фарміраванне і выкарыстанне інфармацыйных рэсурсаў, — кажа **дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі, доктар педагагічных навук, прафесар Раман МАТУЛЬСКІ.** — Рэалізуючы функцыі сацыякультурнага цэнтра, мы развіваем традыцыі культурна-асветніцкіх установ сусветнага значэння.

І сапраўды, наша Нацыянальная бібліятэка працуе на карысць не толькі беларусаў. Яе віртуальнымі гасцямі з'яўляюцца чытачы з усяго свету. Больш як тры чвэрці карыстальнікаў бібліятэкі наведваюць яе менавіта праз інтэрнэт-партал установы.

— Дзякуючы пашырэнню колькасці паслуг, што прадастаўляюцца на нашым партале для віртуальных наведвальнікаў, мы значна пашырылі геаграфію працы з чытачамі. Не так істотна, дзе ты жывеш, — у Мінску, Брэсце, Лондане ці Зімбабвэ, любы чалавек можа скарыстацца нашымі пошукавымі сістэмамі, атрымаць неабходную інфармацыю ў выглядзе лічбавай копіі дакумента ці яго фрагмента, — дадае **намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Алесь СУША.**

Часта здараецца так, што госці горада ці краіны, прыйшоўшы на экскурсію ў «нацыяналку», становяцца яе сталымі чытачамі. Дарэчы, запісацца ў бібліятэку могуць як грамадзяне нашай дзяржавы, так і замежнікі.

За гэтае дзесяцігоддзе ў Нацыянальнай бібліятэцы зроблена шмат і ў кірунку ажыццяўлення выдавецкай дзейнасці. Сёння тут выходзяць як метадычныя дапаможнікі для бібліятэкараў, так і факсімільныя выданні, навукова-папулярныя кнігі.

— Час, калі многае змяняецца, менавіта ў галіне выдавецкай дзейнасці для нас атрымаўся даволі плённым. Мы сталі паўнавартасным выдавецкім цэнтрам, былі аднымі з першых сярод устаноў культуры, хто пачаў афіцыйна выпускаць электронныя выданні, — расказвае Алесь Суша. — Вялікую працу мы робім і для пашырэння ведаў пра нашу культурную спадчыну, выдатных пісьменнікаў, мастакоў.

Дзесяцігоддзе таму, адразу пасля адкрыцця новага будынка, было шмат ахвотнікаў проста трапіць у бібліятэку, пабачыць яе знутры. Сёння сапраўды многае змянілася: беларусы не ўспрымаюць саму бібліятэку як дзіва, ды і ўстанова не стаіць на месцы, жыве актыўным жыццём, праводзіць мноства імпрэз і ладзіць шмат праектаў, карысных для развіцця беларускай культуры.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by* ■

■ Прыёмная кампанія — 2016

# ПРАФТЭХУСТАНОВЫ ЧАКАЮЦЬ АБІТУРЫЕНТАЎ

**15 чэрвеня распачаўся прыём дакументаў ад абітурыентаў ва ўстановы прафесійна-тэхнічнай адукацыі.**

Набор для навучання па рабочых прафесіях ажыццяўляюць 158 устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі і 45 устаноў адукацыі іншых узроўняў, якія таксама рэалізуюць адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Выбіраць моладзь можа з 262 прафесій.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Усяго сёлета плануецца прыняць 32,6 тысячы чалавек. Пры гэтым на дзённую форму навучання плануецца залічыць 30,3 тысячы чалавек, з іх — 19,1 тысячы на аснове агульнай базавай адукацыі, 10,5 тысячы чалавек — на аснове агульнай сярэдняй адукацыі і 700 чалавек — на аснове спецыяльнай адукацыі. План набору на завочную форму складае 1 тысячу чалавек і на вячэрнюю — 1,3 тысячы.

У 2016 годзе ўпершыню будзе ажыццяўляцца набор на новую прафесію «Манціроўшчык шын і шынапнеўматычных муфтаў» у Гомельскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы машынабудавання. А, напрыклад, у Пінскім дзяржаўным індустрыяльна-педагагічным каледжы стане даступнай падрыхтоўка па такіх запатрабаваных прафесіях, як «слесар па рамонце сельскагаспадарчых машын і абсталявання», «трактарыст-машыніст сельскагаспадарчай вытворчасці» і «кіроўца аўтамабіля». Увогуле ва ўсіх рэгіёнах структура падрыхтоўкі была адкарэктавана з улікам патрэб рэгіянальных рынкаў працы, якія пастаянна змяняюцца.

Залічэнне ва ўстановы прафтэхадукацыі ажыццяўляецца на падставе заяў прэтэндэнтаў (пры адсутнасці конкурсу) або па конкурсе сярэдняга бала пасведчання аб агульнай базавай адукацыі, атэстата аб агульнай сярэдняй адукацыі або пасведчання аб спецыяльнай адукацыі. І толькі для асобных профіляў адукацыі («Мастацтва і дызайн» і «Архітэктура і будаўніцтва») прадугледжаны ўступныя іспыты, вынікі якіх улічваюцца пры залічэнні.

Прыём дакументаў для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі на дзённую форму навучання будзе весціся па 20 жніўня. Калі да канца гэтага тэрміну не ўсе планавыя месцы будуць запоўненыя, установа адукацыі па ўзгадненні з заснавальнікам можа падоўжыць тэрмін прыёму дакументаў да поўнага ўкамплектавання груп, але не пазней чым да 15 верасня бягучага года. На завочную форму атрымання адукацыі дакументы будуць прымацца з 1 па 10 кастрычніка.

**Па інфармацыі Міністэрства адукацыі, летась у Мінску і рэгіёнах моладдзю былі запатрабаваныя прафесіі цырульніка, кухара, кандытара, трактарыста-машыніста сельскагаспадарчай вытворчасці і некаторыя іншыя. У той жа час установы прафтэхадукацыі адчувалі значныя цяжкасці пры камплектаванні груп па прафесіях лёгкай прамысловасці, машынабудавання, сельскагаспадарчай вытворчасці, дрэваапрацоўкі і будаўніцтва.**

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■

■ З нагоды

## «Тое, што раён занесены на Рэспубліканскую дошку Гонару — вынік напружанай працы не аднаго дня»

**Алег ПІНЧУК, старшыня Докшыцкага раённага выканаўчага камітэта:**

— У раёна ёсць канкрэтныя дасягненні па некалькіх кірунках. Напрыклад, ён займае адно з лідзіруючых у краіне месцаў па выкарыстанні мясцовых відаў паліва — прыкладна на 90%. А газ уяўляем толькі ў экстранных выпадках зімой...

Шмат робіцца па навядзенні парадку на зямлі, таму ў нас практычна няма пустых і закінутых дамоў. Пры гэтым у раёне больш за 280 населеных пунктаў! Ва ўсіх кожны чацвер наводзім парадак. Такім чынам праводзім наш рэгіянальны так званы чысты чацвер. Прэзідэнт даручыў кіраўнікам улады да кожнага населенага пункта ставіцца, як да сваёй роднай вёскі, двара і дома, дзе нарадзіўся і вырас. Так мы і робім.

У нас таксама вельмі развітая нарыхтоўка дзікарослай прадукцыі: грыбоў і ягад. 500 тон за сезон здаюць больш за 90 нарыхтоўшчыкаў. Гэта дзейнасць — экалагічна перспектыўны кірунак.

Шмат жыхароў займаюцца аграэкатурызмам. Людзі здалёк прыязджаюць да нас адпачыць сілы, адпачыць і атрымаць асалоду ад прыгажосці ў лясах, на берагах вадаёмаў...

Упэўнены, што высокая ацэнка нашай дзейнасці паспрые таму, каб прыкласці яшчэ больш намаганняў для развіцця раёна і роднай краіны.

# ДАПАМОГА Ў ЗОНЕ ДАСТУПНАСЦІ

### У Мінску ўчора пачаў работу IX з'езд анколагаў і радыёлагаў СНД і Еўразіі

**Правядзенне чарговага з'езда ў беларускай сталіцы (першы адбыўся ў 2004 годзе) сведчыць аб тым, што анкалагічная служба краіны знаходзіцца на высокім узроўні. «У Беларусі зроблены вялікі крок у прафілактыцы анказахворванняў, — цытуе намесніка прэм'ер-міністра Наталлю КАЧАНАВУ БЕЛТА. — Летась былі ўведзены ў эксплуатацыю такія ўнікальныя аб'екты, як малекулярна-генетычная лабараторыя канцэрагенезу, цэнтр пазітронна-эмісійнай тамаграфіі. Гэта новы крок у лячэнні і дыягностыцы анкалагічных захворванняў. З боку кіраўніка дзяржавы, урада робіцца ўсё, каб аказанне дапамогі анкахворым было даступным і на ўзроўні рэгіёнаў».**

Паводле выступлення на адкрыцці з'езда **міністра аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Васіля ЖАРКО,** айчынная анкалагічная служба пастаянна ўдасканальваецца, беларускія пацыенты анкалагічнага профілю практычна не накіроўваюцца для лячэння за мяжу. Той факт, што лячэнне раку ў краіне стала адпавядаць сусветнаму ўзроўню, знаходзіць адлюстраванне ў станоўчай дынаміцы пралечаных замежнікаў. Гэта дазволіла прыцягнуць толькі летась каля 3,6 млн долараў. РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава і абласныя анкадыспансеры аснашчаны ўсім неабходным для правядзення анкалагічных аперацый, маюць сучаснае абсталяванне для прамянёвай тэрапіі.

Напярэдадні адкрыцця з'езда Міжнароднае агенцтва па вывучэнні раку і РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава падпісалі мемарандум аб супрацоўніцтве. Дакумент прадугледжвае правядзенне, у першую чаргу, сумесных навуковых даследаванняў, сумесных дзеянняў па супрацьракавай барацьбе і вывучэнні эфектыўнасці супрацьракавых мерапрыемстваў.

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

■ Падпіска-2016

## Наперадзе — Капыль!

Геаграфія звяздоўскіх сустрэч з чытачамі няўхільна пашыраецца. Калі нанесці ўсе нашы вясенне-летнія падарожжы да людзей, якія паважаюць і любяць «Звязду», на карту, то атрымаецца маршрут працягласцю ў многія сотні кіламетраў. І гэта зусім не цяжка, а толькі ў радасць. Прыемна, прызнаемся, завітаць да тых, з кім мы размаўляем на адной мове, з кім нас злучае наша любімая газета.

Сёння мы завітаем у Ашмяны, а заўтра рушым на Міншчыну, у адзін з самых самабытных раёнаў — Капыльскі. Хтосьці ўспомніць тутэйшыя абрады, унесеныя ў Спіс сусветнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА (гаворка ідзе пра семежаўскіх «Калядных цароў»), хтосьці — многіх выдатных людзей, што нарадзіліся тут. Дарэчы, усе месціцы па-свойму адметныя і каларытныя. У гэтым, думаем, пераканаемся заўтра падчас Дня падпісчыка газеты «Звязда». Сустрэчы з чытачамі пройдзць 17 чэрвеня на раённым вузле паштовай сувязі з 11 да 14 гадзін. Абавязкова завітайце — сумаваць не давядзецца!

■ Кампетэнтна

## Найбольшую грамадскую небяспеку нясуць крымінальныя аўтарытэты

**Аб гэтым падчас Аб'яднанай калегіі міністэрстваў унутраных спраў Саюзнай дзяржавы ў Гомелі сказаў Ігар ШУНЕВІЧ, кіраўнік беларускага праваахоўнага ведамства.**

«Найвялікшую грамадскую небяспеку ўяўляюць так званыя «зладзеі ў законе», а таксама лідары і «аўтарытэты» крымінальнага асяроддзя, якія кантралююць злачыннасць і адначасова імкнуцца ўплываць на працэсы, якія адбываюцца ў нашых краінах, — адзначае Ігар Шуневіч. — У сувязі з гэтым неабходна працягваць займаць наступальную пазіцыю ў пытаннях недапушчэння кансалідацыі крымінальных элементаў. Больш актыўна выкарыстоўваць патэнцыял нашых ведамстваў».

Падчас калегіі Ігар Шуневіч разам з Уладзімірам Калакольцавым, міністрам унутраных спраў Расіі, абмеркавалі шэраг пытанняў, якія тычацца ўзаемадзеяння ў барацьбе з арганізаванай злачыннасцю, супрацоўніцтва ў ахове грамадскага парадку, супрацьстаянню злачыннасці на транспарце. «Лічу, абмен думкамі, які адбыўся, быў карысны абодвум бакам і дасць дадатковы імпульс сумеснай дзейнасці нашых ведамстваў. А выпрацаваныя меры будуць садзейнічаць больш актыўнай і наступальнай барацьбе з арганізаваным крыміналам, абароне правоў і інтарэсаў грамадзян ад любых супрацьпраўных замахаў», — сказаў Ігар Шуневіч.

Як паведамілі ў МУС, наступнае пасяджэнне Аб'яднанай калегіі міністэрстваў унутраных спраў Саюзнай дзяржавы пройдзе ў Расіі — у Казані.

**Якаў ЖУРБІН**

■

■ Перспектыва

# У ПРОЦІВАГУ «ДЗІКАЙ» КАНКУРЭНЦЫІ

### Ключавой мэтай новага міністэрства будзе абарона ўнутранага рынку краіны шляхам стварэння роўных канкурэнтных умоў для ўсіх яго ўдзельнікаў

**Аб гэтым учора паведаміў міністр гандлю Уладзімір КАЛТОВІЧ, які падкрэсліў, што стварэнне антыманапольнага міністэрства сведчыць пра гатоўнасць эканомікі нашай краіны і надалей ісці рынечным шляхам, а асноўнай прычынай такой рэарганізацыі стала лібералізацыя рынку.**

Акрамя таго, паводле слоў міністра, менавіта цывілізаваная канкурэнцыя з'яўляецца тым дзейным інструментам, які дазваляе забяспечыць нармальнае цэнаўтварэнне. Таму адной з прычын прыняцця рашэння аб стварэнні Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю стала адсутнасць эфектыўнай канкурэнтнай палітыкі.

### Каб не было змоў

Уладзімір Калтовіч нагадаў, што сёлета ў студзені было прынята рашэнне аб поўнай адмене рэгулявання спажывецкіх цэн. Рэгуляванне засталося толькі на агароднінную групу і ажыццяўляецца мясцовымі органамі ўлады — аблвыканкамамі. «Калі было прынята гэтае рашэнне, я ўзяў на сябе смеласць і сказаў, што цэнавых ўсплёскаў не будзе, таму што ў краіне створана дастатковае канкурэнтнае асяроддзе, якое дазваляе прадавецтвам тавар без завышэння цэн. З іншага боку, у любой дзяржаве свабодная канкурэнцыя, як правіла, прыводзіць і да негатыўных наступстваў у выглядзе манапалістычных праяў — змоў, пагадненняў, якія і з'яўляюцца фактамі неабгрунтаванага ўстанаўлення высокіх коштаў. Таму і паўстала пытанне аб стварэнні антыманапольнага органа», — растлумачыў ён.

«Тая структура ў сферы антыманапольнага рэгулявання, якая існавала ў краіне да апошняга часу, ужо не адпавядае патрабаванням інтэграцыйных працэсаў у межах ЕАЭС», — удакладніў сваю пазіцыю міністр гандлю. «Сёння Беларусь з'яўляецца часткай Еўразійскай прасторы, і нам трэба размаўляць на той жа заканадаўчай «мове», на якой размаўляюць усе астатнія. Ва ўсіх краін ёсць такія органы, ёсць механізмы і падыходы, па якіх фарміруецца антыманапольная палітыка. Цяпер і мы ствараем падобны орган», — паведаміў Уладзімір Калтовіч.

У якасці новай структуры Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Беларусі пачне функцыянаваць з 8 верасня. Паводле слоў міністра, Указам Прэзідэнта аб стварэнні гэтага ведамства адведзена тры месяцы на правядзенне ўсіх працэдур і шэсць — на ўнясенне змяненняў у нарматыўныя прававыя акты, дзе згадваецца Мінгандлю. Цяпер у міністэрстве распрацоўваецца новая структура. Плануецца, што ў ёй будзе некалькі блокаў, у тым ліку па антыманапольным рэгуляванні і цэнавым рэгуляванні. Яшчэ адзін блок тычыцца выканання міністэрствам міжведамасных функцый у частцы рэалізацыі палітыкі ў галіне дзяржаўных закупак, кантролю рэкламнай дзейнасці, абароны правоў спажыўцоў, нетарыфнага рэгулявання і ліцэнзавання, а таксама рэгулявання спажывецкага рынку.

Гандлёвыя інспекцыі на месцах будуць аб'яднаны з антыманапольнымі службамі. «У перспектыве гандлёвыя інспекцыі, якія сёння працуюць толькі з гандлем, стануць працаваць як падраздзяленні, што павінны праводзіць у тым ліку антыдэмпінгавыя даследаванні. Прагназуецца, што ў зоне ўвагі такіх інспекцый будзе не толькі гандаль, але і абсалютна ўсе суб'екты гаспадарання на падведамасных тэрыторыях.

### Супраць нядобрасумленнай барацьбы

А яшчэ міністр паведаміў, што іх спецыялістамі рыхтуюцца змены ў закон аб супрацьдзеянні манапалістычнай дзейнасці і развіцці канкурэнцыі. «Развіццё інстытута абароны ад нядобрасумленнай канкурэнцыі прадугледжвае дэталізацыю пераліку яе формаў. Закон прапануе разгледзець у якасці нядобрасумленнай канкурэнцыі дзеянні суб'екта, накіраваныя на дыскрэдытацыю канкурэнта, прадугледжвае забарону на канкурэнцыю шляхам увядзення ў зман, устанаўлівае забарону на некарэктныя параўнанні. У ім таксама будзе дэталёвае апісанне відаў нядобрасумленнай канкурэнцыі. Асобны артыкул раскрывае формы нядобрасумленнай канкурэнцыі, звязаныя з незаконным атрыманнем, выдаваннем і выкарыстаннем інфармацыі, якая складае камерцыйную тайну», — растлумачыў ён.

Уладзімір Калтовіч адзначыў, што дакумент будзе дапоўнены паняццямі «манапольна нізкая» і «манапольна высокая» цана. «У новым законе прапануецца ўвесці паняцце прыкмет абмежавання канкурэнцыі, якія цяпер адсутнічаюць. Праект закона канкрэтызуе забароны на антыканкурэнтныя акты і дзеянні», — паведаміў ён і дадаў, што антыманапольны орган можа ўплываць на рашэнні дзяржаўных органаў, якія будуць прымацца на шкоду канкурэнцыі. Паводле слоў спікера, гэты закон цяпер унесены на ўзгадненне зацікаўленым дзяржорганам, а разгледзець у парламенце яго плануюць ужо гэтай восенню.

Міністр падкрэсліў, што ў Беларусі на ўзроўні кіраўніка дзяржавы прыняты ўсе рашэнні для забеспячэння будучага Міністэрства антыманапольнага рэгулявання функцыямі для эфектыўнага правядзення палітыкі ў гэтай сферы.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

# КАБ ДЗЯКАВАЦЬ ЖЫЦЦЮ

## У Бараўлянах адкрыўся новы цэнтр паліятыўнай дапамогі

**Усе вокны гэтага будынка выходзяць на поўдзень, а сцены пакояў, з якіх можна адразу выйсці на вуліцу, пафарбаваны ў розныя колеры. Тут няма прамых калідораў, хол незаўважна пераходзіць у пляцоўку для гульні. Побач прытулілася чароўнае дрэва, у кроне якога выразаны розныя фігуркі — яны сімвалізуюць дзяцей, якія нараджаюцца нездаровымі і становяцца нібыта вырванымі з сацыяльнага асяродка. Тут, у новым будынку Беларускага дзіцячага хоспіса, які афіцыйна адкрыўся ўчора ў пасёлку Вопытны, яны вучацца жыць са сваёй хваробай.**

Першыя пацыенты з'явяцца ў ліпені, а пакуль па будынку найбуйнейшага цэнтра дзіцячай паліятыўнай дапамогі маглі прайсціся з экскурсіяй усе ахвотныя. На двух паверхах хоспіса размясціліся 10 пакояў стацыянара (па адным на дзіця), цэнтр дзённага знаходжання, які можа прымаць 20 дзетак, адукацыйны цэнтр, гасцініца для бацькоў маленькіх пацыентаў і капліца. Выязная брыгада спецыялістаў у стане дапамагаць яшчэ 250 хворым. Прынцып «адна нянька для аднаго пацыента», прычым кругласутачна, дзейнічае тут на справе. Спецыяліст можа адказаць на званок бацькоў падапечных цэнтра ў любы час і пракансультаваць. Персанал настолькі кваліфікаваны, што сядзелка здольная і зонд паставіць, і рэанімаваць дзіця.

— Задача цэнтра — вучыць урачоў з рэгіёнаў, каб яны неслі гэты вопыт далей і ў сябе арганізоўвалі невялікія групы паліятыўнай дапамогі, — расказала **Ганна ГАРЧАКОВА, дырэктар Беларускага дзіцячага хоспіса.** — Мы хочам як мага далей адысці ад бальнічных стандартаў, каб не закрываць дзіця, а даць яму магчымасць жыць на волі, гуляць па вуліцы.

Магчымасці абсталявання новага будынка дазваляюць павялічыць колькасць і якасць дапамогі, якая аказваецца цяжкахворым дзецям і іх сем'ям. Аўтаматызаваныя ложкі і спецыяльнае падвеснае абсталяванне з дапамогай своеасаблівага гамака дазваляюць перамяшчаць дзяцей, якія не могуць хадзіць, і на працэдуры, і ў каляску. Так малыя не могуць ударыцца, а бацькі і медсёстры не зрываюць спіны, — пракаментавала дырэктар хоспіса. Дарэчы, бяспечны ложак для самых маленькіх, які можна апусціць на падлогу,ператварыўшы ў манеж, каштуе £ 4000.

У цэнтры дзённага знаходжання дзяцей створаны пэўны мікс паміж умовамі цэнтра сацыяльнай дапамогі і аховы здароўя. Дзеці знаходзяцца ў адным вялікім пакоі для гульняў, адкуль іх па адным забіраюць на працэдуры. Іх тут мноства.

Гідратэрапія, дзе малыя з дапамогай таго ж абсталявання з гамаком трапляюць у вялізную ванну. Пакой ЛФК амаль укамплектаваны, але праз два месяцы сюды прыедзе трэнажор Гроса — спецыяльнае абсталяванне, якое робіцца пад заказ і дазваляе навучыць дзіця правільным рухам, нават калі яно зусім не рухаецца. Будуць тут вучыць бацькоў правільным укладкам, каб не фарміраваліся кантрактуры (калі суставы не могуць разагнуцца), ад якіх пакутуюць дзеці. На гэты момант мала хто звяртае ўвагу ў паліклініках. Ёсць тут і сэнсарны пакой, різлічаны на ўсе ўзросты, і пакой араматэрапіі.

Яшчэ адно абсталяванне, якога чакаюць у вясёлкавым пакоі хоспіса, — спецыяльны ложак-халадзільнік, з дапамогай якога пацыент, які ўжо перасёк жыццёвую мяжу, можа два-тры дні чакаць свайго апошняга падарожжа.

— Мы хочам, каб у цяжкахворых дзетак было не толькі прыстойнае жыццё, а і прыстойны сыход. У Еўропе такое абсталяванне даўно стала неад'емным атрыбутам хоспісаў, дзе навучыліся прымаць філасофію смерці гэтак жа, як і жыцця. Пакуль мы не навучымся паважаць смерць, мы не навучымся жыць, — пракаменціравала дырэктар хоспіса.

Бацькі іншагародніх пацыентаў могуць пажыць у гасцініцы, што знаходзіцца на другім паверсе цэнтра. Гэта агульная кухня з плітой і пральнай машынай, і тры пакоі, дзе могуць знаходзіцца па тры чалавекі.

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by.*



Раман — адзін з падапечных хоспіса — аўтар карціны, на якой намалявана дрэва жыцця на лясной паляне. Яе копія стала магнітам-брошкай, якую арганізатары падчас мерапрыемства дарылі гасцям.



Новыя аўтаматызаваныя ложкі каштуюць шмат, аднак «на такіх пацыентах нельга эканоміць толькі з-за таго, што яны не вылечацца», лічыць дырэктар хоспіса Ганна Гарчакова.



Арганізатары зладзілі з адкрыцця новага будынка хоспіса сапраўднае свята. Для гасцей працавалі розныя пляцоўкі, дзе яны маглі паўдзельнічаць у латарэі, сфатаграфавацца на памяць у «шчаслівай будцы», паглядзець шоу мыльных бурбалак, намаляваць сабе аквагрым і прыняць удзел у іншых забаўках.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

---

■ Разумныя грошы

# І БАНКАМАТЫ БЫВАЮЦЬ «СВАЕ» І «ЧУЖЫЯ»

## Спецыялісты раяць дакладна даведацца пра ўсе нюансы карыстання менавіта вашым «пластыкам», у тым ліку пра памер камісійнага ўзнагароджання

**У мінулым матэрыяле мы пазнаёмілі чытачоў з рэкамендацыямі экспертаў наконт аперацый безнаяўнай аплаты ў інтэрнэце. А сёння мы пагаворым аб асаблівасцях правядзення аперацый з пластыкавай карткай. Гэта, на першы погляд, дробязі, але без іх наша «безнаяўнае» жыццё будзе не зусім беспраблемным. У гэтым нам дапамагае пакрокавы дапаможнік, распрацаваны Нацыянальным банкам краіны.**

### Паслуга на капейку там каштуе рублі

Адразу паспрабуем разабрацца з самымі распаўсюджанымі памылкамі карыстальнікаў пластыкавых картак. Яшчэ пры атрыманні «пластыка» спецыялісты эмітэнта паведамляюць кліенту аб тым, у якіх банкаматах (звычайна даюць цэлы спіс адрасоў) выдача наяўных грошай ажыццяўляецца без страт. А вось банкаматы іншых банкаўскіх структур адмінусуюць з вашага рахунку пэўны працэнт ад знятай сумы наяўных. З падобнымі выдаткамі чалавек згаджаецца толькі ў выключных выпадках, калі яму спатрэбіліся грошы менавіта ў гэтым месцы і ў гэты час.

Іншая справа, калі ўладальнік карткі збіраецца ў «чужым» банкамаце ці інфакіёску атрымаць нейкую інфармацыйную паслугу. Галоўным чынам гэта тычыцца тых, хто вырашыў сэканоміць і не падключыў паслугу SMS-інфармавання аб зробленых па картцы аперацыях і змене рэштак на рахунку. Уставіў чалавек картку ў банкамат не свайго банка, прагледзеў інфармацыю аб тым, колькі ў яго там грошай засталося, а аўтаматыка спіша з яго рахунку ад 7 да 15 тысяч рублёў (у залежнасці ад апетытаў розных банкаў). Адна мая знаёмая толькі за адзін дзень з прычыны сваёй празмернай цікаўнасці страціла з рахунку ажно 120 тысяч рублёў.

Каб падобная навіна не стала для кліента шокам, эксперты Нацбанка рэкамендуюць уважліва знаёміцца з памерам камісійнага ўзнагароджання, які спаганяецца банкам, што выдаў картку, за тыя ці іншыя аперацыі. Памер такога камісійнага ўзнагароджання пры правядзенні адной і той жа аперацыі можа быць розным у банка, які выдаў картку, і ў іншых банкаў.

### Аперацыі канверсіі і абменны курс

Яшчэ больш можна «трапіць на грошы» пры знятці з карткі валюты. Таму пры заключэнні дагавора аб выкарыстанні карткі (крэдытнага дагавора) асаблівую ўвагу трэба звярнуць на палажэнні, якія тычацца аперацый канверсіі (куплі-продажу) з выкарыстаннем карткі і абменнага курса банка, які яе выдаў. Калі валюта рахунку не супадае з валютай аперацыі, курс канверсіі (куплі-продажу валюты), што выкарыстоўваецца для адлюстравання аперацый па рахунку, ужываецца банкам згодна з дагаворам аб выкарыстанні карткі. Напрыклад, банк можа прымяніць курс канверсіі (куплі-продажу) не на дату здзяйснення трымальнікам аперацыі з выкарыстаннем карткі, а на дату адлюстравання аперацыі па рахунку.

І гэта часам мае прынцыповае значэнне, бо ёсць нюансы. Тут неабходна ўлічваць, што спецыфіка здзяйснення аперацый з выкарыстаннем карткі мае на ўвазе наяўнасць часовага разрыву паміж датаю аперацыі і адлюстраваннем яе па рахунку. Працягласць перыяду паміж днём здзяйснення аперацыі і днём яе адлюстравання па рахунку залежыць ад месца ажыццяўлення аперацыі (на тэрыторыі Беларусі або за мяжой), прыналежнасці тэхнічнай інфраструктуры (банку, які выдаў картку, або іншай фінансавай установе), часу ажыццяўлення аперацыі (начны або дзённы час, рабочыя або выхадныя, святочныя дні).

### Аб дадатковай камісіі і DCC

Спецыялісты Нацбанка падрыхтавалі некалькі парад для карыстальнікаў такіх плацежных сродкаў за мяжой. Сапраўды, у залежнасці ад краіны знаходжання пры правядзенні аперацыі з выкарыстаннем карткі можа ўтрымлівацца дадатковая камісія, аб памерах якой мэтазгодна пацікавіцца ў работніка, які вас абслугоўвае, непасрэдна перад здзяйсненнем аперацыі. Таксама такая інфармацыя можа быць адлюстравана на экране банкамата або прылады самаабслугоўвання пры здзяйсненні аперацыі.

Пры аплаце тавараў (паслуг) за мяжой варта звяртаць увагу на наяўнасць сэрвісу Dynamic currency conversion (DCC), што ў перакладзе азначае «дынамічны абмен валюты». Гэты сэрвіс прадугледжвае дадатковы этап канверсіі, што, як правіла, прыводзіць да аплаты дадатковай камісіі: агульная сума пералічваецца ў беларускія рублі па курсе, выстаўленым банкам, які прапануе паслугу DCC. Неабходна ўважліва сачыць за інфармацыяй, што прадстаўлена на экране тэрмінала, а таксама правяраць назвы ў карт-чэку ўмовы правядзення аперацыі (у прыватнасці, варта звяртаць увагу на наяўнасць абрэвіятуры DCC). У выпадку нязгоды з умовамі правядзення аперацыі лепш не пацвярджаць яе подпісам на карт-чэку або ўводам ПІН-кода, а настойваць на адмене аперацыі і яе правядзенні без прымянення дынамічнай канверсіі.

**Уставіў чалавек картку ў банкамат не свайго банка, прагледзеў інфармацыю аб сваім рахунку, а аўтаматыка спіша з яго ад 7 да 15 тысяч рублёў.**

Пры наяўнасці ў банка, які выдаў картку, такой магчымасці, вы можаце забараніць ажыццяўленне аперацый з выкарыстаннем паслугі DCC (напрыклад, праз інтэрнэт-банкінг або непасрэдна ў банку).

### Пра рэквізіты і махлярства

Пры правядзенні аперацый без вашай фізічнай прысутнасці падчас і (або) у месцы правядзення аплаты (напрыклад, з дапамогай пошты, факса, тэлефона і г.д.) паведамляйце (уносьце ў адпаведныя палі) неабходны рэквізіты карткі толькі для правядзення аперацый, якую вы самі ініцыявалі і лічыце правамернай. У выпадку, калі вы ўсё ж пацярпелі ад махлярства: неабходна неадкладна звярнуцца ў службу кліенцкай падтрымкі банка, які выдаў картку, для яе блакавання і прытрымлівацца рэкамендацый спецыяліста. Па факце махлярства рэкамендуецца падаць заяву ў праваахоўныя органы.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
16 ЧЭРВЕНЯ 2016 г.
ЧАЦВЕР
№ 11 (15795)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

# «Славянскія акцэнты» Гроса



**Чатыры гады таму гэты юнак трапіў у прадзюсарскі цэнтр «Спамаш», дзе і сёння займаецца пабудовай сольнай кар'еры артыста. А пачынаў ён свой шлях на эстраду яшчэ ў родным Салігорску. Загартоўваў сябе на розных конкурсах, фестывалях. І вось цяпер рыхтуецца да пакарэння новай вяршыні. Аляксей Грос прадставіць нашу краіну на XXV міжнародным конкурсе маладых выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2016», які пройдзе ў рамках фестывалю «Славянскі базар». Сустрэўшыся са спеваком, мы даведаліся, як ён ацэньвае сваю гатоўнасць, і чым будзе радаваць прыхільнікаў песні.**

***— Як падрыхтоўка да такога адказнага мерапрыемства адбіваецца на вашым рытме жыцця?***

— Я з тых артыстаў, якім не прывыкаць да няспыннага тэмпу ў працы, хоць цяпер ён значна паскорыўся. Перакананы ў адным: настойлівая праца заўсёды дае вынік.

У працэсе падрыхтоўкі да «Славянскага базару» са мной працуюць найлепшыя прафесіяналы. З Дзінай Тыцюк мы займаемся тэхнікай маўлення, з Людмілай Куц адточваем вакал. Дзмітрый Забалотны дапамагае ў пытаннях стылю. З Максімам Пугачовым, Віталікам Вячэрскім з гурта «Радыёхваля» мы працавалі над аранжыроўкамі да конкурсных кампазіцый. Леанід Шырын на час конкурсу выступае маім музыкальным прадзюсарам, а курыруе ўсю падрыхтоўку да фестывалю Сяргей Адрыянаў. Таксама кантактуем і з шэрагам іншых людзей. Напрыклад, сустракаліся з Валерыем Дайнекам (ён выконваў выбраную мной песню «Ой, дожджык ідзе» ў 1978 годзе) і Пятром Ялфімавым (буду выконваць яго рок-баладу «Я хачу»), раіліся, цікавіліся іх думкамі адносна нашага бачання іх песень.

***— Чула, вы рыхтуеце цікавую промапрадукцыю ў нацыянальным стылі...***

— Памятныя падарункі канкурсантам будуць у выглядзе вышыванак. Нам хочацца, каб у людзей, якія прыедуць у нашу краіну, засталося нешта цёплае на ўспамін аб паездцы. Такія ж майкі мы рыхтуем для сям'і Алы Пугачовай, якая вяртаецца сюды праз 15 гадоў. Менавіта тады на «Славянскім базары» Ала Барысаўна пазнаёмілася з Максімам Галкіным. Таксама для спявачкі ў нас будзе асаблівы падарунак — генеалагічнае дрэва яе роду. Ён у часы царскай Расіі пачаўся з Магілёўскай губерні. Таксама ў нацыянальным стылі будзе і ўніформа для ўсёй маёй каманды.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Свой выбар

# ТРАПІЦЬ У МАСЦЬ,

## ці Новае амплуа для каня

**Прызнайцеся, хто з нас у маленстве не прыходзіў у захапленне, убачыўшы чарговага ката, сабаку ці іншую жыўнасць? Некаторыя потым звязваюць усё сваё жыццё з жывёламі. У прыклад можна прывесці 29-гадовага навуковага супрацоўніка лабараторыі конегадоўлі, зверагадоўлі і дробнай жывёлагадоўлі Навукова-практычнага цэнтра па жывёлагадоўлі Нацыянальнай акадэміі навук Ганну РУДАК. Дзяўчына з ранняга дзяцінства так любіла коней, што ў рэшце рэшт яны сталі для яе прафесіяй.**



Фота Надзеі БУЖАН.

— У маленстве разам з сястрой (мы з ёй, дарэчы, двайняты) ездзілі ў Глыбоцкі раён да дзеда, у якога быў уласны конь, — расказвае Ганна. — Пэўна, там усё і пачалося. У выніку разам паступілі ў Віцебскую ветэрынарную акадэмію: я на заатэхніка, а сястра — на ветурача. На чацвёртым курсе ў нас з'явіўся асобны прадмет па конегадоўлі, і я вырашыла, што гэты кірунак цікавіць мяне найбольш. Нават дыплом пісала па беларускім запражным кані — нашай адзінай нацыянальнай пародзе. Тады ж упершыню апынулася ў Жодзіне — прыехала на мясцовую ферму «Зарэчча», дзе разводзяць такіх коней. Менавіта навуковая дзейнасць прыносіла найбольшую асалоду — у мяне былі найлепшыя адзнакі на курсе, таму вырашыла далей рухацца менавіта ў гэтым кірунку.

У ветакадэміі Ганне выдалі накіраванне на вучобу ў магістратуру, а пасля яе заканчэння ў 2011-м яна паступіла ў аспірантуру НПЦ па жывёлагадоўлі Акадэміі навук.

— Галоўнае, чым я займаюся цяпер, — гэта падрыхтоўка дысертацыі, — кажа Ганна. — Тэма? Калі казаць простай мовай, вывучаю эфектыўнасць розных племянных падбораў для размнажэння, іх спалучальнасць. Папярэдняя праца была прысвечана атрыманню канкурэнтаздольных коней айчыннай селекцыі без удзелу імпарту. Рабіць гэта можна рознымі шляхамі, напрыклад, адбіраць тых жарабцоў, якія паказалі найлепшыя вынікі ў спорце, і кабыл, што даюць добрае патомства, а потым скрыжоўваць іх. Перад гэтым ацэньваецца генетычная спалучальнасць будучых пар, іх імуналагічная сумяшчальнасць. Лічу, справа гэта вартая, бо калі набываць жывёлу тракенскай або гановерскай пароды з-за мяжы, яна будзе каштаваць 7-8 тысяч долараў, а выведзеная ў Беларусі — 3-4.

Па словах Ганны, айчынныя коні выкарыстоўваюцца пераважна ў сферы спорту і адпачынку. Даволі папулярнай апошнім часам становіцца іпатэрапія — лячэбная верхавая язда. Якраз для яе часта бяруць беларускіх запражных. Па словах Ганны, наша нацыянальная парода мае аптымальны рост (да 160 сантыметраў, на такіх жывёл зручна саджаць дзяцей) і спакойны тэмперамент, што робіць яе ідэальнай для лячэбных працэдур.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

Цікавы досвед

# АД АЛЕІ ЗОРАК ДА ПІКНІКОЎ

## Як зрабіць, каб вучань адчуваў сябе ў школе камфортна

**«Кожны дзень прыносіць штосьці новае, так што карыстайся!», «Да мэты рухайся ўпарта, але з розумам! Удачы табе!», «Усмешка — гэта бясплатна!» , «Усміхайся часцей! Ва ўсмешцы — багацце чалавека», «Ветлівасць — каштоўны ключ, які адчыняе ўсе дзверы!» — такія аптымістычныя фразы аўтару артыкула давялося пабачыць на дзвярах класных пакояў у школе ў прыгарадзе Варшавы.**

### УРОКІ БЕЗ ЗВАНКОЎ

— Мы спецыяльна шукаем і разважаем выказванні, якія прымушаюць дзяцей пры ўваходзе ў клас і ўсміхнуцца, і расслабіцца, і задумацца, — тлумачыць **дырэктар пачатковай школы №97 у Пястове Уршула СКШЫПЧАК**, якая ладзіць для беларускіх педагогаў экскурсію па навучальнай установе. — Нашу школу можна назваць сучаснай, але з багатай гісторыяй — два гады таму мы адзначалі яе стагадовы юбілей. У школьным музеі захоўваецца арыгінальны штандар, які школа атрымала ў 1933 годзе. Дзякуючы клопатам аднаго з супрацоўнікаў, ён шчасліва перажыў вайну і вярнуўся ў родныя сцены. Тут жа ў музеі можна ўбачыць і школьную парту (за такімі вучыліся сённяшнія настаўнікі), і апошнюю школьную форму, абавязковае нашэнне якой было адменена ў Польшчы ў 2007 годзе.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*



**На перапынках дзеці сядзяць у калідорах на падлозе: хтосьці ўтыкаецца ў свой смартфон ці планшэт, хтосьці жуе бутэрброд ці проста размаўляе з сябрам...**

Складанасці выбару

# КАМУ ПАТРЭБЕН РЭПЕТЫТАР

## Бацькам ці найперш самому выпускніку?

**Усім даўно вядомы трохвугольнік «вучань-настаўнік-бацькі» паволі ператвараўся ў квадрат. Трывалае месца ў сістэме сучаснай адукацыі занялі рэпетытары. Ні для кога ўжо даўно не сакрэт, што для паспяховай здачы цэнтралізаванага тэсціравання выпускнікі школ усё часцей звяртаюцца па дапамогу менавіта да іх. Чаму так адбываецца?**

Каб разабрацца ў гэтым, я вырашыла даведацца меркаванні адразу некалькіх бакоў. Для пачатку апытала саміх вучняў. На тры нескладаныя пытанні адказалі 50 выпускнікоў. Высветлілася, што 86% з іх карыстаюцца паслугамі рэпетытараў, адпаведна толькі 14% самастойна рыхтуюцца да здачы цэнтралізаванага тэсціравання. 25% маюць рэпетытара па адным прадмеце, 35% — па двух і 40% — па трох. Найбольш папулярнымі прадметамі, па якіх вучняў «падцягваюць» рэпетытары, з'яўляюцца руская мова, матэматыка, англійская мова і фізіка. Таксама я папрасіла пазначыць прычыну індывідуальных заняткаў. Большасць (42%) назвала незразумелы для іх матэрыял, 23% звярнуліся па дапамогу праз недахоп школьных ведаў, 19% — па прычыне пропуску часткі школьнай праграмы, 13-ці працэнтам трэба, каб іх нехта прымушаў вучыцца, а астатніх прымусілі бацькі. Я таксама падлічыла агульную колькасць рэпетытараў. Лічба немалая: на 43 вучні (тыя самыя 86%) — 91 рэпетытар. І гэта толькі па адной школе.

Я таксама пацікавілася думкай бацькоў: па якой прычыне яны нанялі свайму дзіцяці рэпетытара? Абагульнены адказ гучыць так: «У школе рыхтуюць да экзамену і атрымання атэстата, і многія педагогі не ведаюць методык падрыхтоўкі да ЦТ. А ў рэпетытараў ёсць выпрацаваная сістэма, асабліва па такіх прадметах, як матэматыка, фізіка і хімія, да якіх самастойна вельмі складана падрыхтавацца. Рэпетытар выступае ў ролі матыватара, да таго ж і заняткі індывідуальныя».

Для паўнаты меркаванняў я звярнулася да **Міхаіла БАРАНАВА, першакурсніка БНТУ**, які летась паспяхова здаў цэнтралізаванае тэсціраванне, падрыхтаваўшыся да яго самастойна.

— Па-мойму, рэпетытары не даюць нічога такога, што не могуць даць настаўнікі ў школах ці чаго нельга знайсці ў інтэрнэце або ў падручніках. Да таго ж за такія заняткі бацькі плацяць немалыя грошы.

Мая падрыхтоўка заключалася ў рашэнні розных варыянтаў ЦТ і рэпетыцыйнага тэсціравання за мінулыя гады (хаця б некалькі разоў на тыдзень). Зборнікі з тэстамі можна ўзяць у школьнай бібліятэцы або купіць у кнігарні. Сваім вынікам я задаволены: паступіў на спецыяльнасць, якую выбраў яшчэ на пачатку навучальнага года, з запасам у 88 балаў. Прахадны бал быў 242, я набраў 330. Па рускай мове — 87, матэматыцы — 66, фізіцы — 81.

Лічу, што большасці абітурыентаў проста не хапае сілы волі, каб сесці і вывучыць матэрыял. Зусім не шкадую, што рыхтаваўся да тэсціравання без рэпетытараў, нават наадварот. Сістэма адукацыі ва ўніверсітэце адрозніваецца ад школьнай: у ВНУ ніхто не прымушае вучыць, рабіць заданні, хадзіць на лекцыі і г.д. Усё залежыць ад цябе самога, ад таго, колькі часу і як ты будзеш займацца. Я ў пэўным сэнсе ўжо быў падрыхтаваны да такога падыходу.

Сваёй думкай пра рэпетытарства падзялілася і **намеснік дырэктара па навучальнай рабоце мазырскай СШ №9 Надзея Андрэеўна КОЛАС:**

— Гэта адна з дадатковых формаў навучання, якая дапамагае вучню не проста падмацаваць і паглыбіць свае веды, але і адчуць сябе больш упэўнена. Абапіраючыся на практыку, скажу, што індывідуальная праца рэпетытара з абітурыентамі забяспечвае ім добры псіхалагічны настрой.

**«Усё залежыць ад цябе самога, ад таго, колькі часу і як ты будзеш займацца. Я ў пэўным сэнсе ўжо быў падрыхтаваны да такога падыходу».**

**— Як вы лічыце, чаму так шмат абітурыентаў звяртаецца па дапамогу да рэпетытараў? Чыя гэта віна?**

— Нічыёй віны тут няма. У школьнай праграме прадугледжана максімальная колькасць формаў падрыхтоўкі да ЦТ. Гэта факультатывы, стымулюючыя заняткі, платныя заняткі, кансультацыі падчас канікул. Акрамя гэтага, на ўроках ідзе дыферэнцыяцыя. Кожны настаўнік ведае вучняў, якія будуць здаваць яго прадмет. Адпаведна, цягам навучальнага года педагог дапамагае ім зарыентавацца. Аднак бывае, што ў вучня прысутнічае няўпэўненасць і яму патрэбен кантакт з настаўнікам сам-насам. Зразумела, што забяспечыць такі кантакт, калі ў класе 30 дзяцей, немагчыма. Вось у такіх выпадках вучні і звяртаюцца да рэпетытараў. Аднак трэба мець уласнае жаданне дасягнуць высокіх вынікаў, інакш і рэпетытар мала чым дапаможа.

**— Я праводзіла апытанне сярод вучняў старшых класаў, і многія з іх прычынай рэпетытарства называюць недастатковасць школьных ведаў...**

— Праблемы назапашваюцца не адзін год. Калі вучань мае звычку вучыцца на высокім узроўні, то і прабелаў у ведах у яго будзе куды менш. На сваім вопыце я пераканалася, што ЦТ — гэта вельмі фундаментальная праверка школьных ведаў і за рамкі школьнай праграмы заданні не выходзяць. Дарэчы, калі казаць пра рэпетытараў, то не кожны возьмецца рыхтаваць слабага вучня. Звычайна рэпетытары з высокай рэпутацыяй хочуць працаваць толькі з мацнейшымі школьнікамі, якія прывыклі да сістэматычнай працы. Гаварыць пра недастатковасць ведаў вучням можа ў тым выпадку, калі прапусцілі нейкі аб'ём вучэбнага матэрыялу. Але ж ліквідаваць прабелы можна не толькі за кошт рэпетытарства. Галоўнае — уключыць жаданне і ісці на кантакт з настаўнікам. Ніводзін педагог не адмовіць у дапамозе.

**Вікторыя КУПРАЦЭВІЧ, выпускніца 11 класа СШ №14**
*г. Мазыра.*

# АД АЛЕІ ЗОРАК ДА ПІКНІКОЎ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

У 1997 годзе школа перабралася ў новы будынак: і ён, і прастора вакол, нават гульнявая пляцоўка, прыстасаваны пад патрэбы для дзяцей з абмежаванымі рухальнымі магчымасцямі.

Школу ў Пястове без перабольшання можна назваць асаблівай. З 2001 года тут дзейнічаюць інтэграваныя класы. І побач са звычайнымі вучацца і дзеці з асаблівымі патрэбамі: напрыклад, з аўтызмам і сіндромам Аспергера. У такіх класах абавязкова працуюць два педагогі: асноўны і дапаможны, які на працягу ўрока перамяшчаецца па класе і аказвае дапамогу ўсім навучэнцам, хто просіць аб гэтым. А можа і проста апекавацца адным, калі размова ідзе пра дзіця з аўтызмам. Пры гэтым, што немалаважна, заробак і ў першага, і ў другога педагога аднолькавы. Па законе напаўняльнасць інтэграванага класа не можа перавышаць 20 чалавек, а дзяцей з асаблівымі патрэбамі ў такім калектыве можа быць да пяці. Для іх у школе прадугледжаны спецыяльныя пакоі: сэнсарнай тэрапіі, музычнай тэрапіі, дзе з імі працуюць псіхолагі і іншыя спецыялісты.

**Дзеці бяруць на месяц кніжку, якая не ўваходзіць у спіс абавязковай літаратуры, але перад чытаннем атрымліваюць 5 пытанняў. Галоўнае — не проста чытаць, а чытаць удумліва.**

У калідоры гучыць кароткі званок.

— Гэта сігнал для старшых класаў (пачатковая школа ў Польшчы — з 1-га па 6-ты класы. — **Аўт.**), а малодшыя вучацца ў нас без званкоў, — кажа дырэктар. — Настаўнік сам вызначае, калі дзецям патрабуецца перапынак. Магчымасць жыць без званкоў у пачатковых класах ёсць ва ўсіх школах, але не ўсе ёй карыстаюцца, бо настаўнікам прасцей жыць ва ўстаноўленых 45-хвілінных рамках. У нашай школе таксама на выхадныя дні дзецям прынцыпова не задаюць пісьмовых заданняў.

## Пачастуй і ўсміхніся

...Варшава, гімназія №7 з інтэграванымі класамі. Здагадацца, што ў калектыве ёсць асаблівае дзіця, можна толькі па прысутнасці на ўроку другога педагога.

У школьным калідоры ў вочы адразу кідаецца «алея зорак». Чытаем на іх: «Найлепшы марафонец», «Варшаўскі салавей», «Правая рука кіраўніка», «Майстар на ўсе рукі», «Прыроджаны шоумэн»...

— Такія ўзнагароды вучні атрымліваюць за розныя таленты і дасягненні, не звязаныя з вучобай, напрыклад за сваю актыўную валанцёрскую дзейнасць, музычны ці артыстычны талент, — уводзіць у курс справы **намеснік дырэктара гімназіі Катажына МЕРСКА-ГРОМЕК.** — Адзін з вучняў атрымаў зорку за тое, што часта заставаўся пасля ўрокаў і дапамагаў настаўніку прыбірацца ў класе. У Польшчы ёсць тэлевізійная перадача «Ідэальная гаспадыня», таму педагогі вырашылі абыграць гэтую назву і ўручылі зорку «Ідэальнаму гаспадару». Напрыканцы навучальнага года мы праводзім урачысты сход, дзе і абвяшчаем новых уладальнікаў уласнай зоркі. Іх не так і шмат. Гэта насамрэч павінны быць выдатныя дасягненні. Таму на сцяне вы бачыце і зоркі, якія належаць ужо нашым выпускнікам.

А тым часам позірк выхоплівае абвестку з намаляваным кубачкам кавы і надпісам «Прынясі, пачастуй, усміхніся». Высвятляецца, што ў гімназіі рыхтуюцца да святкавання міжнароднага дня шакаладу: на 15-хвілінным перапынку падлеткі будуць частаваць адзін аднаго цукеркамі і шакаладам. Такія тэматычныя дні ўжо паспелі стаць традыцыйнымі.

Увагу прыцягвае і вельмі ўтульнае памяшканне для групы падоўжанага дня. Прыйсці сюды можа любы вучань на перапынку ці пасля урокаў: адпачыць ці чымсьці заняцца. Дзейнічае адзіны прынцып — знаходзіцца ў гэтым пакоі – прывілея, а не абавязак. Таму галоўнае правіла — трэба прыстойна сябе паводзіць. Усе гімназісты карыстаюцца пластыкавымі ідэнтыфікатарамі, якімі яны могуць адчыніць дзверы, таму адміністрацыі вядома, хто сюды зайшоў, а хто выйшаў.

## Клуб па інтарэсах

Наступны візіт — у Канстанцін (гэта таксама прыгарад Варшавы). Калектыў школьнага комплексу №1 ахвотна дзеліцца з беларускімі настаўнікамі сваімі вопытам і педагагічнымі знаходкамі, напрыклад тым, як можна захапіць сучасных дзяцей чытаннем. У школьнай бібліятэцы прыдумалі акцыю, да якой можа далучыцца кожны ахвотны. Дзеці бяруць на месяц кніжку, якая не ўваходзіць у спіс абавязковай літаратуры, але перад чытаннем атрымліваюць 5 пытанняў. Галоўнае — не проста чытаць, а чытаць удумліва. Вучням прапануюцца кніжкі, якія могуць іх захапіць: прыгодніцкія ці гістарычнага характару... Адказваць на пытанні трэба ў пісьмовай форме.



**Школьны музей пачатковай школы № 97 у Пястове: за такімі партамі вучыліся сённяшнія настаўнікі.**

Разгорнутыя і прыгожыя адказы заахвочваюцца бонусамі. Цягам навучальнага года на кожнага вучня атрымліваецца 10 дадаткова прачытаных кніг. А галоўная ўзнагарода — паездка на Варшаўскі кніжны кірмаш, дзе дзеці могуць паўдзельнічаць у трэнінгах, семінарах і выбраць для сябе адну кніжку бясплатна. Калі пяць гадоў таму ў акцыі ўдзельнічалі 12 вучняў, то сёлета — ужо 97 (фактычна ў акцыю ўцягнуты кожны пяты вучань школы).

Увогуле школьная бібліятэка — гэта і клуб па інтарэсах, і цэнтр школьнага жыцця, усё дзякуючы апантаным людзям, якія тут працуюць. Прыйсці сюды можна ў любы час (з 8 раніцы да 16 гадзін) не толькі каб пачытаць, але і для таго, каб зрабіць урокі ці заняцца яшчэ чым-небудзь карысным у чаканні школьнага аўтобуса. Прыгожы акварыум з рыбкамі таксама апякуецца вучнямі. Каб не выкідаць падручнікі, што састарэлі маральна, дзеці пад кіраўніцтвам бібліятэкара Ірэны Каўчар робяць з іх разнастайныя фігуры, якія расстаўлены па ўсіх паліцах. А яшчэ спадарыня Ірэна арганізавала «кацінае валанцёрства»: у Канстанціне ёсць прытулак для бадзяжных жывёл, і дзеці разам з бібліятэкаркай пастаянна яго наведваюць (збіраюць корм, старыя газеты, рыззё, знаходзяць для котак гаспадароў).

## Новыя выклікі часу

Адна з самых яскравых падзей для вучняў і іх бацькоў — школьны пікнік, які праводзіцца бліжэй да канца навучальнага года. Гэтае свята дапамагае школе сабраць сродкі на закупку абсталявання: інтэрактыўных дошак, мультымедыйнага класа або трэнажораў... Для ўсіх гасцей школьнага свята ладзяцца розныя атракцыёны: «паветраныя замкі», скачкі і гэтак далей. Спонсары прадстаўляюць для латарэі свае прызы. Кошт удзелу ў атракцыёнах ці латарэі сімвалічны: ад двух да пяці злотых. Але калі ўсё добра прадумаць і арганізаваць, то за адзін пікнік можна сабраць 20 тысяч злотых У снежні школай таксама ладзіцца святочны калядны кірмаш, але яго размах больш сціплы — сума збораў да 10 тысяч злотых. Кіраўніцтва школы жартуе: «Калі ласка, не паведамляйце ў падатковую інспекцыю...»

— Бацькі нашых вучняў вельмі патрабавальныя, але, можа, гэта і добра: ціск з іх боку прымушае нас інтэнсіўна працаваць, — канстатуе **дырэктар школы Паўліна КАРЧМАРЧЫК.** — Калі вучня цікавіць нейкі пэўны прадмет ці галіна ведаў, настаўнікі распрацоўваюць фармат індывідуальнай працы з такім вучнем. Гэта новы выклік, які стаіць перад школай, і мы імкнёмся на новую патрэбу часу адпаведна рэагаваць. І ўвогуле прыслухоўваемся да ўсіх прапаноў бацькоўскай грамадскасці. Дзевяць гадоў таму, калі я ўзначаліла школу, тут было 16 класаў, а цяпер — 25. Бацькі жадаюць, каб іх дзіця навучалася менавіта ў нас. Наша школа невялікая, але мы пакуль спраўляемся. Больш таго, вельмі радуемся таму, што ёсць такая цікавасць да школы, бо гэта і ацэнка нашай працы.

## Вучоба вочы ў вочы

Дарэчы, навучальны год у польскіх школах пачынаецца, як і ў нас, 1 верасня, а вось завяршаецца ў апошнюю пятніцу чэрвеня. Субота і нядзеля — выхадныя дні для ўсіх: і для школьнікаў, і для педагогаў.

Сістэма школьнай адукацыі ў Польшчы трохступеньчатая: з 1-га па 6-ты клас — пачатковая школа, з 7-га па 9-ты — гімназія (базавая адукацыя), з 10-га па 12-ты — ліцэй (агульная сярэдняя адукацыя).

Што для беларусаў абсалютна нязвыкла — тое, што на перапынках дзеці ва ўсіх школах сядзяць у калідорах на падлозе: хтосьці ўтыкаецца ў свой смартфон ці планшэт (падчас урокаў гаджэты просяць здаваць), хтосьці жуе бутэрброд ці проста размаўляе з сябрам. Першае ўражанне — сапраўдны хаос. Але і на ўроках часта вучэбны працэс праходзіць таксама на падлозе... У пачатковай школе класныя пакоі падзелены на дзве зоны: ёсць зона з партамі, а ёсць зона з дываном на падлозе, куды вучні могуць «прызямліцца» разам са сваім настаўнікам. Такім чынам вучоба адбываецца вочы ў вочы. Настаўнік «апускаецца» на ўзровень дзіцяці. А заданні навучэнцы могуць выконваць нават лежачы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота аўтара.**
*nikalaeva@zviazda.by*
*Мінск—Варшава—Мінск.*

З базай у галаве

# Удала прыПАРКавацца

**Якой будзе сфера IT праз пяць гадоў? На што трэба звяртаць увагу абітурыентам? Адказы на гэтыя і многія іншыя пытанні гучалі падчас сустрэчы «Шчыра запрашаем у свет інфармацыйных тэхналогій», арганізаванай адміністрацыяй Парка высокіх тэхналогій. Пракансультавацца да спецыялістаў у бізнес-інкубатар установы прыйшлі амаль паўтысячы абітурыентаў, у тым ліку з рэгіёнаў.**



— Мы вельмі б хацелі, каб беларусы былі не пасіўнымі назіральнікамі, а самі станавіліся стваральнікамі прарыўных тэхналогій. Акрамя гэтага, мы ўпэўнены, што менавіта IT-адгалінаванне можа стаць ключавым для нашай эканомікі і зрабіць багатымі не толькі асабіста вас, але і нашу краіну. — сказаў падчас сустрэчы **кіраўнік парка Валерый ЦАПКАЛА.**

Адміністрацыя парка сёлета падрыхтавала каталог-даведнік для тых, хто паступае на IT-спецыяльнасці. У ім сабрана поўная інфармацыя пра ўсе факультэты краіны, якія рыхтуюць спецыялістаў для гэтай сферы: пералік спецыяльнасцяў, прахадныя балы і многае іншае. Спампаваць дакумент у электронным выглядзе можна на сайце ПВТ.

Кіраўнікі кампаній парка — **дырэктар ТАА «Артокс Лаб» Аляксандр ЛІНД і дырэктар ВУП «Белка Геймз» Марына КОРСУН** — расказалі пра асноўныя трэнды ў IT-адгалінаванні і пра тое, якія спецыяльнасці будуць запатрабаваныя ў сферы праз пяць гадоў. «Насамрэч вельмі цяжка адказаць, што будзе з інфармацыйнымі тэхналогіямі праз такі тэрмін, — лічыць Аляксандр Лінд. — Таму галоўнае, што зробіць вас запатрабаванымі, — здольнасць да пастаяннай і бесперапыннай вучобы. Як толькі вы падумаеце, што ўсё ведаеце, вы скончыцеся як спецыяліст. Змены накрыюць з такой хуткасцю, што вы ўжо не паспееце за імі. Галоўнае, на што трэба абапірацца — уласныя адчуванні. Шукайце тое, што вам падабаецца рабіць. Бо заўсёды будзе попыт і на тых, хто ўмее ствараць нешта новае, і на тых, хто ўмее кіраваць ужо створаным, і на тых, хто ўмее вучыць новаму іншых». «Акрамя здольнасці вучыцца, я б адзначыла яшчэ гатоўнасць працаваць больш за восем гадзін у суткі, — дапоўніла калегу Марына Корсун. — Бо тыя аб'ёмы працы, якія сёння прыходзіцца выконваць нашым супрацоўнікам, звычайна не ўкладваюцца ў стандартны графік».

— Штогод у парку ствараецца тры тысячы новых працоўных месцаў, прыкладна трацiну з іх займаюць выпускнікі беларускіх універсітэтаў, — распавёў **намеснік дырэктара адміністрацыі ПВТ Аляксандр МАРЦІНКЕВІЧ.** — Пры гэтым, па нашых падліках, усяго ў краіне па IT-спецыяльнасцях кожны год выпускаецца каля шасці тысяч чалавек. Таму можна дакладна сказаць, што мы забіраем да сябе найлепшых. Гэта тыя, хто ўжо ўсё ўмее і абсалютна гатовы да працы ў вялікіх кампаніях. «Давучваць» кагосьці на месцы ніхто не збіраецца. Увесь адукацыйны працэс перанесены ў сцены нашых ВНУ, і яны нядрэнна спраўляюцца са сваёй задачай. Гэтаму спрыяюць і шматлікія сумесныя лабараторыі і філіялы, якія ствараюць кампаніі-рэзідэнты на базе ўніверсітэцкіх кафедр. Таму, калі студэнт адказна вучыцца, не прагульваў заняткі і цалкам засвоіў праграму, праблем з уладкаваннем на добрае месца ў яго не павінна ўзнікнуць. Іншае пытанне, якіх ведаў вымагае ад выпускнікоў час. Большасць кіраўнікоў кампаній кажа супрацоўнікам, што вывучэнне камп'ютарных моў — гэта справа нажыўная, асвоіць новае можна вельмі хутка. А вось асновы праграмавання і алгарытмізацыі, фізіка (бо вельмі актыўна развіваюцца прыкладныя і навукаёмістыя кірункі IT), матэматыка — гэта фундаментальныя рэчы. А менавіта на іх студэнты звычайна звяртаюць менш увагі, маўляў, дысцыпліны не зусім «профільныя».

Выказаўся намеснік дырэктара ПВТ і па набалелай для многіх абітурыентаў праблеме здачы фізікі для паступлення на IT-спецыяльнасці. Паводле яго слоў, пытанне аб магчымай замене ЦТ па фізіцы на англійскую мову было канчаткова закрыта на адным з нядаўніх «круглых сталоў» з удзелам усіх дэканаў адпаведных факультэтаў. Яны аднагалосна выказаліся супраць такіх змен, зыходзячы са сваёй практыкі: студэнты, якія здавалі замест фізікі англійскую мову, заўважна горш засвойвалі асновы алгарытмізацыі.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

**■ ДАВЕДКА «ЧЗ»**

**Топ-10 самых запатрабаваных у ПВТ спецыяльнасцяў у 2015 годзе:**

- аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі;
- вылічальныя машыны, сістэмы і сеткі;
- інжынерна-псіхалагічнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій;
- інфарматыка;
- інфарматыка і тэхналогіі праграмавання;
- інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі;
- інфармацыйныя тэхналогіі і кіраванне ў тэхнічных сістэмах;
- штучны інтэлект;
- камп'ютарная бяспека;
- матэматыка.




# ГЕРОІ КАНАПАВАГА СПОРТУ

**На мінулым тыдні ў Расіі адбылася без сумнення эпахальная падзея — Міністэрства спорту суседняй дзяржавы афіцыйна прызнала камп'ютарныя гульні спартыўнай дысцыплінай. Насамрэч упершыню гэта адбылося яшчэ 15 гадоў таму, але ў 2006-м кіберспорт страціў свой высокі статус. А вось цяпер вярнуў. Зараз расійскія аматары відэагульняў могуць станавіцца так званымі КМС-мі і МС-мі, а спаборніцтвы па «танчыках», DotA 2 і іншаму — праводзіцца пад эгідай Мінспорту.**

Я вельмі люблю спорт. І амаль гэтак жа моцна люблю камп'ютарныя гульні. Разам з сябрамі мы можам правесці суботу з мячом на рэальным стадыёне, а нядзелю — на віртуальным, гуляючы дзень напралёт у FIFA 16 на прыстаўцы. Але я катэгарычна супраць таго, каб аматараў праводзіць вечар з мышкай ці джойсцікам у руцэ лічылі спартсменамі. Бо такі лад жыцця дыскрэдытуе само слова «спорт».

Адразу пасля з'яўлення навіны ў медыяпрасторы інтэрнэт адрэагаваў шквалам жартаў на гэту тэму. Скажам, распаўсюджаныя ў матывацыйных пабліках карцінкі, на якіх знаходзяцца выявы мускулістых мужчын з подпісамі кшталту «спартыўныя хлопцы-прыгажуны», перарабілі, замяніўшы іх на фота «не самых падцягнутых» геймераў з тым жа тэкстам. Ну і пра «кандыдатаў у майстры «Доты» нажартаваліся напоўніцу.

Але ў гэтых жартах ёсць рацыянальнае зерне — геймерства, асабліва ў «прафесійным» яго выглядзе, ну ніяк не цягне на гучнае званне «спорт». Адзін мой знаёмы, які зарабляў сабе на жыццё развіццём і продажам герояў у ролевай анлайн-гульні, аднойчы не выходзіў з кватэры... два месяцы. Самай вялікай фізічнай актыўнасцю для яго ў гэты час былі падарожжы на кухню і ў прыбіральню. Калі вы лічыце, што цяперашнія кіберспартсмены ў перапынках паміж трэніровачнымі бойкамі за камп'ютарам выходзяць на прабежкі, то таксама памыляецеся.

Пра ўплыў камп'ютара на арганізм расказваць лішні раз, я думаю, не трэба. Акрамя псавання зроку і паставы, ёсць цэлы шэраг прычын рэкамендаваць знаходзіцца за маніторам як мага менш часу. Згодны, прафесійны спорт — траўманебяспечны. Але калі, скажам, прафесійны футбол папулярызуе аматарскі (які звычайна гульцу нічым не пагражае), то кіберспорт, што прафесійны, што не, здароўя яшчэ нікому не дадаваў.

Многія абураюцца: «Дык і шахматы, і кёрлінг, і дартс, і шмат чаго яшчэ спортам лічацца ўжо многія гады, чым горшы кіберспорт?» Так, але, на мой погляд, названыя вышэй віды трэба хутчэй выкрасліць са спартыўных класіфікатараў, а не дадаваць да іх яшчэ адзін. Пры ўсёй несумненнай вартасці шахмат фізічнаму развіццю чалавека яны спрыяюць мала. А спорт, пры ўсіх акалічнасцях і інтэрпрэтацыях слова, — гэта ў першую чаргу культ чалавечага цела і яго магчымасцяў. Вельмі не хочацца, каб здарылася сітуацыя, якую некалі абыгрывала каманда КВЗ БДУ — матч чэмпіянату свету па картачнай гульні ў «дурня» за званне дурня свету.

Паверце, мне вельмі балюча, калі я праязджаю побач са школай, у якой вучыўся — на стадыёне, дзе калісьці стаялі чэргі з хлопаў, якія хацелі пагуляць у футбол, цяпер пуста. Аднойчы ўзрадаваўся, убачыўшы рознакаляровыя футболкі, прыглядзеўся — а ў пары гульцоў зусім не дзіцячыя бароды. Здаецца, надышоў той час, калі хлопчык у бутсах выклікае павагу сам па сабе. Нядаўна размаўляў з былым настаўнікам па фізкультуры — той шчыра здзіўлены, што многія яго вучні не могуць злавіць кінуты мяч, бо амаль не трымалі гэты прадмет у руках і маторыка ў іх зусім не развітая. Затое, упэўнены, з камп'ютарнай мышшу яны спраўляюцца значна лепш.

Вяртаючыся да тэмы кіберспорту, скажу толькі вось што. Здаецца, што прызнанне камп'ютарных гульняў відам спорту ў шэрагу краін — гэта ўсяго толькі вынік кручэння велізарных грошай у гэтай сферы. Чэмпіёны па DotA 2 атрымліваюць ганарары, якія нават не сніліся многім лёгкаатлетам. Каментатары чэмпіянатаў па World of Tanks у сацсетках абыходзяць па папулярнасці сваіх тэлевізійных калег. Камп'ютарныя турніры збіраюць аўдыторыю, нашмат большую за спаборніцтвы ў самых папулярных відах атлетыкі. Так, геймерства займела ўсе атрыбуты сапраўднага спорту, але ці стала праз гэта спортам? Не думаю.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

Добрыя сэрцы

# «МАЗГАВЫ ЦЭНТР» РУХУ

## Рэспубліканскі валанцёрскі цэнтр урачыста адкрыўся ў Мінску

**Ён стане пляцоўкай для абмену вопытам, вучобы, падрыхтоўкі, будзе займацца распрацоўкай і каардынацыяй праграмы развіцця валанцёрскага (добраахвотніцкага) руху ў Беларусі, рэалізацыяй праектаў і акцый, правядзеннем «круглых сталоў» і сустрэч з прадстаўнікамі дзяржструктур, сацыяльных устаноў, распрацоўкай прапаноў па ўдасканаленні заканадаўчай базы ў галіне валанцёрскай дзейнасці і г.д.**



— Цяпер у краіне валанцёрствам займаюцца больш за 52 тысячы маладых людзей. Цэнтр дасць моладзі магчымасць атрымліваць інфармацыю пра новыя праекты, знаёміцца з цікавымі людзьмі, — расказаў **намеснік міністра адукацыі Віктар ЯКЖЫК.**— Менавіта тут актыўныя юнакі і дзяўчаты змогуць даведацца пра акцыі, дзе патрабуюцца іх рукі, веды і вопыт. Радуе, што ўсё больш маладых людзей разумеюць: беcкарысліва дапамагаючы іншым, ты дапамагаеш, перш за ўсё, сабе. Развіваеш такія чалавечыя і хрысціянскія якасці, як міласэрнасць, клопат пра блізкіх — якасці, якімі заўсёды вылучаліся беларусы.

Арганізатары цэнтра таксама маюць намер адкрыць інтэрнэт-рэсурс з прававымі, метадычнымі, даведачнымі, інфармацыйнымі матэрыяламі, якія датычаць валанцёрскай (добраахвотніцкай) дзейнасці.

У цырымоніі ўрачыстага адкрыцця цэнтра прынялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства адукацыі, Цэнтральнага камітэта БРСМ, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, лідары дзіцячых і маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў, кіраўнікі валанцёрскага руху і, вядома, галоўныя героі свята — валанцёры.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

У гонар альма-матар

# ЛЮБЛЮ ЦЯБЕ, БДУ!

**У Беларускім дзяржаўным універсітэце выпусцілі кліп на песню «This is BSU». У гэтай кампазіцыі студэнты выказваюць сваю ўдзячнасць альма-матар за перспектывы, магчымасць пазнаёміцца з новым светам і шанц у будучыні стаць паспяховымі і незалежнымі. Галоўным лейтматывам песні з'яўляецца думка пра тое, што БДУ — «шчаслівы квіток» у жыцці кожнага студэнта.**

Стварэнне кліпа аб'яднала таленты з розных факультэтаў Белдзяржуніверсітэта. Аўтарам песні стаў чацвёртакурснік факультэта сацыякультурных камунікацый Алег Шчуцкі. Мелодыя прагучала ў выкананні квартэта ў складзе другакурсніцы Інстытута журналістыкі Анжалікі Пушновай, чацвёртакурсніцы Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій Валянціны Паўлавай, пяцікурсніка філалагічнага факультэта Улада Чыжыкава і згаданага Алега Шчуцкага. Акрамя вакалістаў, у кліпе зняліся ўдзельнікі конкурсу талентаў «Фестываль эстрады БДУ».

Плануецца, што ўрачыстая прэзентацыя кліпа на песню «This is BSU» адбудзецца на свяце першакурсніка 1-га верасня і стане выдатным стымулам для паспяховай вучобы. У найбліжэйшай будучыні ёсць намер зняць з тымі ж героямі іміджавы музычны ролік пра складаную і адказную вучобу ў БДУ, але ў той жа час неверагодна вясёлае і разнастайнае жыццё ва ўніверсітэце.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# ТРАПІЦЬ У МАСЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Праца па вывядзенні новых і ўдасканаленні старых парод займае вельмі працяглы час. Бо конь — аднаплодная жывёла, выношвае жарабя 11 месяцаў, — распавядае Ганна. — На беларускага запражнога пайшлі дзесяцігоддзі, парода была афіцыйна зацверджана і прызнана толькі ў 2000 годзе. Яе вывелі з мясцовых коней, паляпшаючы прывезенымі з-за мяжы пародамі. Але ў нас ёсць і сапраўдныя «абарыгены», напрыклад, палескі конь, што жыве на поўдні Беларусі са старажытных часоў («бацька» беларускага запражнога, продкам якога ў сваю чаргу быў славуты тарпан). Гэта невысокая парода (фактычна беларускі поні), якая выдатна прыстасавалася да жыцця ў балотных умовах. На жаль, сёння яна знаходзіцца ў занядадзе, калі не сказаць больш — на мяжы вымірання. Нашы супрацоўнікі займаюцца ўратаваннем палескага каня.

Акрамя навуковай працы, Ганна часта прымае ўдзел у спаборніцтвах у якасці суддзі. Разам з іншымі ацэньвае самыя розныя характарыстыкі жывёл. Дзяўчына дэманструе нам некалькі фотаздымкаў, на якіх на кожнай частцы цела коней стаяць адзнакі ад аднаго да дзесяці. Як тлумачыць навукоўца, так ацэньваецца экстэр'ер (знешні выгляд) жывёлы. Галава павінна быць у пэўных прапорцыях да цела, круп — мець пэўную форму, ногі — адпавядаць сваім паказчыкам, і ўсё гэта для кожнай пароды сваё. Акрамя таго, коней ацэньваюць па правільнасці кроку, рысі і галопу, за гэта таксама выстаўляюць адзнакі.

**Няцяжка здагадацца, як Ганна праводзіць свой вольны час. Першая справа пасля заканчэння працоўнага дня — заехаць на «Зарэчча» і сустрэцца з любімымі выхаванцамі.**

— Мне прыкра, што конегадоўля ў нашай краіне цяпер развіваецца з цяжкасцямі, — уздыхае Ганна. — Вядома, гэтыя жывёлы амаль канчаткова страцілі сваю ролю ў сельскай гаспадарцы, бо ўсё робіцца машынамі, але гэта не значыць, што трэба зусім адмовіцца ад іх. Ёсць шэраг новых кірункаў — тая ж іпатэрапія, адпачынак, турызм... Мне здаецца, што ім не хапае рэкламы — не ўсе ведаюць, што можна прыйсці і пакатацца за адэкватныя грошы з карысцю для настрою і здароўя. Пэўныя зрухі ёсць, але ўвогуле сітуацыя складаная. Імгненнай выгады ад гэтага чакаць нельга, таму многія кіраўнікі гаспадарак імкнуцца як мага хутчэй пазбавіцца ад коней у мэтах эканоміі...





Фота Надзеі БУЖАН.

**«Калі набываць жывёлу тракенскай або гановерскай пароды з-за мяжы, яна будзе каштаваць 7-8 тысяч долараў, а выведзеная ў Беларусі — 3-4».**

Няцяжка здагадацца, як Ганна праводзіць свой вольны час. Першая справа пасля заканчэння працоўнага дня — заехаць на згаданае вышэй «Зарэчча» і сустрэцца з любімымі выхаванцамі. Дзяўчына даглядае дарослых коней і жарабят, займаецца выездкай і многім іншым. І толькі на выхадныя Ганна едзе на радзіму ў Полацк да сястры. «Двайнятам нельга надоўга расставацца», — кажа яна.

За выдатныя поспехі ў навуцы дзяўчына сёлета стала лаўрэаткай Прэзідэнцкай стыпендыі для таленавітых маладых вучоных. Акрамя статусу, такая ўзнагарода — гэта яшчэ і істотная фінансавая падтрымка. Стыпендыя па сваім памеры нават перавышае зусім невялікі заробак. З жыллём у спецыялісткі праблем не было — цэнтр выдзеліў ёй пакой у інтэрнаце блочнага тыпу, зусім блізка ад месца працы.

— Сярод планаў на будучыню ў першую чаргу, безумоўна, абарона дысертацыі, — кажа Ганна. — Са ступенню кандыдата і заробак будзе большым, і магчымасці. Сыходзіць нікуды не збіраюся, прынамсі пакуль. Магчыма, у будучыні захочацца паспрабаваць сябе ў Ратамцы: на конезаводзе ці па спартыўнай частцы. Мая мара — з'ездзіць у Германію і паглядзець на арганізацыю конегадоўлі там. Але працаваць, нягледзячы на ўсе праблемы, хачу ў Беларусі.

**Наша нацыянальная парода мае аптымальны рост (да 160 сантыметраў, на такіх жывёл зручна саджаць дзяцей) і спакойны тэмперамент, што робіць яе ідэальнай для лячэбных працэдур.**

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
lyskavets@zviazda.by
*Мінск — Жодзіна — Мінск.*

*Форма і змест*

## ЖЫЦЦЁ ПАД ПЕРАСТУК КОЛАЎ

**Інга АЛЯКСЕЙЧЫК — 19-гадовая праваднiца з Івацэвіч — адносіцца да тых людзей, якія з вялікай ахвотай робяць сваю работу.**

— Мая спецыяльнасць называецца «Арганізацыя і абслугоўванне пасажырскіх перавозак». Працую я на Мінскім вагонным участку. Асноўныя кірункі — Адлер, Анапа, Мінеральныя Воды. Часам, бывае, езджу па Беларусі.

Яшчэ з 5 класа я марыла быць праваднiцай. Хацела паступіць пасля 9-га, але не атрымалася. А пайшла, бо прывабліва форма і заўсёды хацелася падарожнічаць. Я люблю гутарыць з людзьмі, а ў нас кожны раз новыя суразмоўцы, сумна ніколі не бывае. Вырашыла пайсці ў Брэсцкі дзяржаўны каледж чыгуначнага транспарту.

**— Якімі былі першыя ўражанні?**

— Вучыцца было дастаткова цяжка: не думала, што праваднік павінен столькі ўсяго ведаць! Калі гаварыць пра работу, па першым часе таксама было нязвыкла і складана з-за таго, што дома магла адсутнічаць цэлы тыдзень. Але, як той казаў, да ўсяго прывыкаеш. Ну а цяпер ні кроплі не шкадую! Мне здаецца, усе мае чаканні адносна працы спраўдзіліся.

**— Інга, раскажы пра спецыфіку сваёй прафесіі...**

— Калі знаходжуся на працы, то, без перабольшвання, жыву ў цягніку. У рэйсе звычайна знаходжуся шэсць дзён, потым столькі ж дома. Мяне такі графік цалкам задавальняе. Заробку для адной таксама хапае. Што да пэўных складанасцяў... Душа ў цягніках няма, харчуемся тым, што трапіць пад руку, зімой прастаяць на пасадцы гадзіну вельмі складана, зрэшты, як і летам таксама. Дрэнна тое, што большасць свят працую. Так, напрыклад, прайшлі Новы год, Каляды, 8 Сакавіка. Мы праводзім іх, як звычайныя дні. Часам самі пасажыры спрабуюць стварыць нам святочны настрой: хтосьці жартуе, нехта пачастункі прыносіць.

**— Ці часта даводзіцца праяўляць характар?**

— На рабоце і дома я — два розныя чалавекі. У рэйсе сапраўды бывае, што трэба паводзіць сябе строга. Пасажыры ж бываюць розныя. І кожны дзень адбываюцца цікавыя гісторыі, я нават канкрэтную адну не змагу вылучыць, бо за адзін рэйс можна перавезці 400 чалавек. Але прыемныя і ветлівыя спадарожнікі трапляюцца часта. Часам яны развітваюцца са слязамі на вачах, а я сама стаю і ледзь не плачу. За два дні так прывыкаеш да людзей, што, здаецца, знаёмая з імі ўжо даўно.

**— А ці ёсць час на знаёмства з новым горадам?**

— Калі мы прыязджаем у пункт прызначэння, нам трэба перш за ўсё прыбраць у цягніку, а ўжо потым можна ісці гуляць па горадзе. Але пасля прыборкі не вельмі і хочацца куды-небудзь выбірацца, бо моцна стамляешся. Мне вельмі спадабалася ў Адлеры і Сочы.

Здорава, калі чалавек захоплены тым, што робіць. Інга яшчэ не строіць планаў на будучыню, але гаворыць з усмешкай: «Безумоўна, хацелася б павышэння, магчыма, стаць начальнікам цягніка». Здаецца, жарты, але ўсё магчыма, калі займаешся любімай справай.

**Таццяна ЛАУШ, студэнтка III курса факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму ГрДУ ім. Я. Купалы.**

*Сваімі рукамі*

## ЗВАЛЯЦЬ... ЦАЦКУ

**Трымаю ў руках невялікае медзведзяня, якое Наста САКУЛЬСКАЯ зрабіла ўсяго за 40 хвілін. Дзяўчына вучыцца на завочным аддзяленні БДПУ імя М. Танка (спецыяльнасць «Выкладчык-мастак»), працуе ў багетнай студыі, дзе выконвае афарміцельскія заданні, а ў вольны час займаецца сухім валеннем. Як з'явілася думка рабіць цацкі з воўны?**

— Я чалавек творчы, таму да цацак ужо займалася бісерапляценнем і керамікай, пісала карціны, рабіла дэкаратыўныя абручы з гафрыраванай паперы. А тут неяк у сацыяльных сетках убачыла цацку-выдрачку, яна была як жывая. Захацелася зрабіць нешта падобнае.

**— І што, апроч жадання, для гэтага трэба?**

— Калі хочаш займацца валеннем, трэба адчуваць форму, інакш будзе цяжка нешта стварыць. Трэба разумець, як пойдзе лінія, як запхаць воўну, куды і як націснуць.

Для валення ёсць спецыяльныя іголачкі. Яны адрозніваюцца ад звычайных: у іх няма вушак, яны даўжэйшыя ў два разы. Усё неабходнае можна набыць у спецыяльных крамах. Воўна і прыстасаванні для працы каштуюць нядорага. Напрыклад, 10 грамаў патрэбнага матэрыялу прадаюцца за 15 тысяч, іголкі — за 20 тысяч рублёў.

**— Як знаходзіш вобразы для сваіх вырабаў?**

— У асноўным падглядаю ў інтэрнэце. Каб зрабіць вялікую цацку, патрэбна каля васьмі гадзін працы. На маленькую ідзе тры-чатыры, часам нават менш — усё залежыць ад эскіза, які задумала. Звычайна я не раблю цацку цалкам за дзень, пакідаю працу на наступны. Потым



Наста Сакульская і яе цацкі.

гляджу, што трэба дабавіць, што выправіць. Вось быццам бы ўсё добра, але чагосьці не хапае. А прышпіліла банцік на галаву — атрымалася дзяўчынка, прычапіла яго на шыю — хлопчык. Кожная цацка павінна быць асаблівай.

**— Ці хацела б зрабіць велізарную цацку?**

— Ростам з чалавека? Гэта ж колькі трэба воўны вычасаць! Самая вялікая цацка ў мяне была 50 сантыметраў, яе я рабіла восем гадзін. Але паспрабаваць было б цікава!

**Настасся ЖУХАРАВА, студэнтка IV курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

*Бяспечная сеціва*

# ІНТЭРНЭТ-ПАСТКІ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ,

## або Чаго сапраўды павінны баяцца бацькі

**Паводле статыстыкі, палова дзяцей па ўсім свеце праводзіць час у сеціве без бацькоўскага нагляду. Гэта дае падставы задумацца, хто насамрэч займаецца выхаваннем будучага пакалення — дарослыя ці інтэрнэт?**

— Сёлета ў Беларусі сумесна з ЮНІСЕФ завяршаецца вялікае даследаванне па гвалце над дзецьмі, які адбываецца дома, ва ўстановах і на вуліцы. Пра інтэрнэт-гвалт таксама нельга забываць, бо сёння дзеці праводзяць анлайн большую частку вольнага часу, — расказаў **прадстаўнік Дзіцячага фонду ААН у Рэспубліцы Беларусь Рашэд Мустафа САРВАР.**

Ён лічыць, што працаваць над дзіцячай бяспекай у інтэрнэце неабходна ў трох кірунках: з бацькамі, непасрэдна з дзецьмі, а таксама асобна з падлеткамі. «Падлеткі — асобная катэгорыя, якая патрабуе асаблівай увагі. Нельга забараніць ім карыстацца інтэрнэтам, але можна патлумачыць правілы анлайн-бяспекі».

— Інтэрнэт — гэта люстэрка рэальнага жыцця. Там ёсць шмат станоўчага: прадстаўлены культура, мастацтва, навука і іншае. Аднак хапае там і адмоўнага, таго, ад чаго мы аберагаем нашых дзяцей у рэальнасці. Таму нельга грэбаваць інтэрнэт-бяспекай, — лічыць **Юрый НАМЕСНІКАЎ, эксперт па дзіцячай бяспецы ў інтэрнэце, кіраўнік расійскага даследчага цэнтра «Лабараторыі Касперскага».** — Большасць дзяцей намагаецца схаваць ад бацькоў сваю вэб-актыўнасць, якая можа ім не спадабацца. Адны карыстаюцца ананімайзерамі, другія заходзяць у інтэрнэт, калі бацькоў побач няма, трэція ставяць паролі на гаджэтах.

**Нярэдка новыя «сябры» ўваходзяць у давер да дзіцяці, а пасля пачынаюць прасіць фотаздымкі інтымнага характару, якімі ў далейшым могуць шантажыраваць усю сям'ю.**

Статыстыка воблачнага сэрвісу Kaspersky Security Network пры ўключаным «Бацькоўскім кантролі» на персанальным камп'ютары паказала, што беларускія дзеці найчасцей заходзяць у сацыяльныя сеткі, чаты і пошту (72%). На другім месцы па наведвальнасці апынуліся сайты з анлайн-гульнямі (10%). У параўнанні з расійскімі дзецьмі беларускія ў два разы радзей бываюць на рэсурсах, дзе змешчана інфармацыя пра алкаголь, табак і наркатычныя рэчывы (14,5% і 8% адпаведна).

Юрый Наменснікаў лічыць, што пагрозы, якія бачацца бацькам, і пагрозы, што рэальна існуюць у інтэрнэце, не супадаюць. Бацькі думаюць: горшае, што можа здарыцца, — дзіця «пасадзіць» здароўе з-за доўгага знаходжання каля камп'ютара, планшэта ці смартфона. Насамрэч у першую чаргу баяцца трэба небяспечных незнаёмцаў у сацыяльных сетках. Яны могуць чапляцца да вашага дзіцяці і абражаць яго, схіляць да нелегальных учынкаў, дзяліцца недапушчальным кантэнтам або, наадварот, выведваць прыватную інфармацыю — нумары банкаўскіх картак бацькоў, пашпартныя звесткі і г.д. Нярэдка новыя «сябры» ўваходзяць у давер да дзіцяці, а пасля пачынаюць прасіць фотаздымкі інтымнага характару, якімі ў далейшым могуць шантажыраваць усю сям'ю. Неабходна ведаць: тое, што аднойчы трапляе ў сеціва, застаецца там назаўсёды.

Яшчэ адна пагроза — кібербулінг — запужванне, здзек, кпіны ў інтэрнэце з боку равеснікаў. Згодна з апытаннем, якое правяла Лабараторыя Касперскага сумесна з парталам «Сетевичок.рф», 58% дзяцей сутыкаліся з такой праблемай.

— Нават калі само дзіця або яго знаёмыя падвяргаюцца кібербулінгу, яны не гатовы размаўляць пра гэта з дарослымі. Часам бацькі могуць і самі заўважыць, што ў дзіцяці праблемы, але можа быць ужо позна. Вельмі важна растлумачыць: сэнс кібербулінгу ў тым, каб ахвяра як мага больш адказвала на нападкі, — кажа эксперт.

Паколькі на чацвёртым месцы па наведваннях у інтэрнэце сярод беларускіх дзяцей знаходзяцца сайты крам і сістэм аплаты, то існуе небяспека неабдуманых пакупак. Дарэчы, гэтая праблема закранае і тых, хто цікавіцца анлайн-гульнямі: мяжа паміж віртуальнымі і рэальнымі грашыма хутка сціраецца. Вядомыя выпадкі, калі дзеці, гуляючы, трацілі дзясяткі тысяч долараў на «дадатковыя функцыі».

А бывае, што пагроза ўзнікае там, дзе яе зусім не чакаюць, — у пошукавых сістэмах. Найчасцей маленькія карыстальнікі натыкаюцца на «кантэнт 18+» выпадкова, а не мэтанакіравана. Недакладныя запыты прыводзяць дзяцей на такія сайты, змест якіх можа моцна паўплываць на іх псіхіку.

Падсерагае ў інтэрнэце і заражэнне шкодным праграмным забеспячэннем. Дзеці не вельмі разборлівыя ў выбары крыніц, якім можна давяраць, таму яны з лёгкасцю націскаюць на спасылкі, не азнаёміўшыся з інфармацыяй пра іх. Між іншым, сёння Беларусь знаходзіцца на шостым месцы ў свеце па колькасці атакаваных карыстальнікаў у інтэрнэце.

Некаторыя бацькі, імкнучыся засцерагчы сваё дзіця ад небяспекі, зусім забараняюць выхад у вэб-прастору або кантралююць кожны крок, у тым ліку чытаюць усе атрыманыя паведамленні. Безумоўна, так рабіць нельга. Забараніць — значыць адкінуць дзіця ў мінулае, не дазволіць яму быць сучасным. А татальны кантроль — гэта ўвогуле парушэнне элементарнай этыкі і пазбаўленне права на асабістае жыццё. Каб зрабіць знаходжанне дзяцей у інтэрнэце максімальна бяспечным, Юрый Наменснікаў раіць карыстацца наступнымі правіламі.


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Бацькі:**

- звяртайце ўвагу на тое, чым дзіця займаецца ў сеціве;
- заўсёды будзьце ў курсе навінак у IT-сферы;
- карыстайцеся тэхналогіямі бацькоўскага кантролю;
- стварайце асобныя ўліковыя запісы на ПК для кожнага члена сям'і, нават для самых маленькіх дзяцей;
- абараняйце ўсе прылады: ПК, смартфон і планшэт;
- вучыце дзіця правілам бяспекі ў сеціве;
- карыстайцеся тымі ж сацыяльнымі сеткамі, што і ваша дзіця.

**Дзеці:**

- расказвайце бацькам, пра свае праблемы, звязаныя з інтэрнэтам;
- не пакідайце ў публічным доступе і не дасылайце незнаёмцам у сеціве сваю кантактную інфармацыю або фінансавыя звесткі;
- не згаджайцеся на ўгаворы незнаёмых людзей у сеціве на асабістую сустрэчу;
- не пераходзьце па спасылках у паведамленнях ад невядомых адрасатаў і не адкрывайце спам-паведамленні;
- не паддавайцеся на празмерна заманлівыя прапановы ў інтэрнэце;
- памятайце, што пры пакупках у інтэрнэце трацяцца рэальныя грошы;
- расказвайце сваім бацькам пра новыя тэхналогіі і новыя пагрозы, пра якія даведаецеся самі;
- не публікуйце інфармацыю, якая ў будучыні можа скампраметаваць вас ці вашых знаёмых.

**Ганна КУРАК,**
**студэнтка IV курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

*Да свайго «я»*

# «СМЕРЦЬ МЯНЕ НЕ ПУЖАЛА»

## ГІСТОРЫЯ НАРКАМАНА, ЯКІ ЗМОГ «ЗАВЯЗАЦЬ»

**Дзіму* 20 гадоў. Жыве ў Мінску, працуе электраслесарам пасля каледжа. Плануе паступіць у «вышку», зрабіць кар'еру і завесці сям'ю. Напэўна, як і большасць хлопцаў у яго ўзросце. Праўда, дасягнуць сваіх мэт Дзіму складаней, чым яго аднагодкам. Ён наркаман, а ў гэтай справе, кажуць, былых не бывае. Змагацца з залежнасцю даводзіцца штодня, і апошнія паўтара года Дзіму гэта ўдаецца. Як дзеці з нармальных сем'яў становяцца наркаманамі і чаму вельмі складана вярнуцца да звычайнага жыцця? Хлопец падзяліўся сваёй гісторыяй.**

Па словах Дзімы, ён быў узорным падлеткам. Не курыў, на піва не налягаў. Наркотыкі паспрабаваў праз цікаўнасць. Гады тры таму хлопец зайшоў у госці да сяброў і ўбачыў, што тыя «пад кайфам». Захацеў таксама даведацца, што гэта за адчуванні, і папрасіў падзяліцца дозай. Гэта быў спайс.

Праз пару тыдняў Дзіму зноў пацягнула ўжыць. А яшчэ праз колькі часу гэта ўжо стала штодзённай звычкай.

— Аднойчы я прыйшоў дадому накураны, і бацькі заўважылі, — прыгадвае малады чалавек. — Плакалі мне спаць, а раніцай сур'ёзна паразмаўлялі. Мама патэлефанавала бацькам хлопца, з якім мы ўжывалі, папярэдзіла, каб той не набліжаўся да мяне. Я паабяцаў, што больш не буду прымаць наркотыкі. З'ехаў у санаторый на месяц, перастаў. А потым ізноў...

| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 01 июля 2016 г. в 14.00**
**по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом — резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом — нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя — доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам — документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица — доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении.

Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звезда» от 02.12.2015 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:**
**г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник — четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**
**Последний день приема заявлений — 27 июня 2016г. до 15.00**

*Телефон для справок: 45-05-38 –*
*Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»*
*Дополнительная информация http://grodnoino.by/*

SEX-БАЛЯСЫ

# СТАРТАВЫ КАПІТАЛ

**Вядомая ўсім Ганна Семяновіч нядаўна вырашыла раскрыць прыхільнікам сакрэт сваіх пышных формаў. Відаць, стамілася ад пытанняў і нездагадлівасці. Дык вось, аказваецца, каб быць прывабнай, яна выкарыстоўвае... малако. Па словах артысткі і тэлевядучай, кожны дзень выпівае шклянку, з'ядае порцыю карыснага ёгурту, а перад сном любіць паласавацца кефірам. Бачыце, як усё проста? Як той казаў, налівайце ды піце — і будзе вам дзявочае шчасце. Праўда, Ганна Семяновіч сціпла прамаўчала, што для падтрымання фізічнай формы яна рэгулярна займаецца спортам, бо пры дапамозе адных толькі малочных прадуктаў наўрад ці атрымаецца выглядаць стройнай і падцягнутай. («Баксёры лепш за іншых ведаюць, што ў жыцці больш за ўсіх дастаецца людзям, якія апускаюць рукі».) А вось што тычыцца тых самых пышных формаў...**

Калі прыгадаць даўнія фотаздымкі Ганны, асаблівай пышнасці на іх не заўважыш. («Размаўляюць два навукоўцы. «Калега, вам не здаецца, што гэта крывалінейная лінія імкнецца да прамой?» — «Згодны, грудзей зусім няма».) Як раптам у нейкі момант — о цуд! — яна (пышнасць) з'яўляецца. Такі па-спартыўнаму імклівы старт, аб «паходжанні» якога можна толькі здагадвацца, да цяперашняга «капіталу» артысткі і тэлевядучай. «Капіталу», які сёння і прыносіць Ганне дывідэнды ў выглядзе папулярнасці (ну, і нешта яшчэ «капае»), бо ні новымі спартыўнымі дасягненнямі, ні нейкай выключнай акцёрскай ігрой яна, на жаль, пахваліцца не можа. Вось хіба толькі формамі... А яны ў стасунках паміж людзьмі могуць быць рознымі.

Ала Пугачова дзеля новага шоу Максіма Галкіна знялася... агаленай у ванне. Па сюжэце рэкламнага роліка 67-гадовая прымадонна ляжыць у ёй у пене, як у пэўны момант у вобразе Джэка Вераб'я з'яўляецца малады сужэнец. Праект Галкіна, у якім вядомыя асобы прымяраюць на сябе розныя ролі, стартаваў адносна нядаўна і пакуль не можа пахваліцца высокім рэйтынгам. Прадзюсары шоу і не ўтойваюць, што менавіта па гэтай прычыне вырашылі прарэкламаваць яго ад імя Алы Пугачовай. («Маленькі Ізя ніколі не крычаў у краме цацак: «Купі-купі!» Ён пачынаў здалёк. Напрыклад: «Мама, а тваё дзяцінства таксама было цяжкім і бязрадасным?») І Ала Барысаўна, як тая любячая маці, не магла адмовіць сужэнцу.

**Сапраўдная любоў — гэта калі ты памыў ката, а ён усё адно да цябе ідзе. Зычу кожнаму такога стартавага капіталу і няўхільнага яго памнажэння.**

А вось зорка «Гульні тронаў» Кіт Харынгтан нядаўна расказаў пра тое, што яму даводзіцца сутыкацца ў Галівудзе з сексізмам у дачыненні да сябе. Ён паскардзіўся: маўляў, у кінаіндустрыі мужчын часта бяруць на працу выключна з-за іх знешнасці. Акцёр заявіў, што, калі падчас фотасесіі яго просяць раздзецца, ён якраз і адчувае той самы сексізм. Назваў такое стаўленне двайнымі стандартамі і паведаміў, што стаміўся ад пытанняў пра асабістае жыццё, мускулы і валасы. Адмовіўся, выходзіць, скарыстацца сваім акцёрскім стартавым капіталам? («У школе я быў узорным хлопчыкам. Мяне заўсёды ставілі ў прыклад: «Не рабі так, як ён!») З іншага боку, гэтая «зорка» — адзін з нямногіх мужчын-акцёраў, які з'явіўся ў серыяле агаленым. Дык, можа, ужо атрыманыя ганарары дазваляюць яму так выказвацца? («Студэнта, які не атрымлівае стыпендыі, лёгка пазнаць па новенькай іншамарцы».)







Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

Псіхолагі з Пекінскага педагагічнага ўніверсітэта высветлілі, што на рамантычныя адносіны паміж людзьмі ўплываюць не толькі пачуцці і эмоцыі, але і тое, наколькі яны адчуваюць сябе паспяховымі і багатымі ў параўнанні з іншымі. Падчас эксперымента добраахвотнікам раздалі пэўную колькасць манет, пасля чаго падзялілі іх на дзве групы: заможных і бедных. Ім трэба было ацаніць задавальненне як сваім дастаткам, так і прывабнасцю партнёра. Высветлілася, што заможныя мужчыны былі задаволены сексуальнай прывабнасцю другой палавінкі ў меншай ступені, чым тыя, хто лічыў, што іх дастатак невялікі. («Дарагая, ты прыгожая, як гэтыя кветкі!» — «А я думала, што прыгожая, як залаты бранзалет». — «Не, ты прыгожая, як гэтыя кветкі».) А вось жанчыны, якія лічылі сябе заможнымі, не завышалі сваіх патрабаванняў адносна знешнасці мужчын.(«І тут яна гаворыць: «Хачу з табой прачынацца кожную раніцу, а больш нічога не хачу». А ты думаеш: «Нішто сабе, а праца-ваць хто будзе? А гатаваць? А прыбіраць? Нармальна ўладкавалася!»)

Італьянскія навукоўцы, вывучыўшы даныя па падаткаплацельшчыках Фларэнцыі, выявілі: нашчадкі сярэднявечных багацеяў і сёння ў спісе самых заможных грамадзян. За амаль 600 гадоў, праз 25 пакаленняў, практычна не змяніліся ні прозвішчы, ні суадносныя памеры капіталаў, ні нават прафесіі. Яно і не дзіва: пры дапамозе стартавага капіталу ў выглядзе спадчыны куды лягчэй прымнохыць багацце. («Фінансавае становішча: хаджу ў краму са сваім пакетам».)

Вядома, справа не ў сродках, хоць і без іх ніяк. («Грошы мяне не хвалююць. Грошы мяне супакойваюць».) Ведаеце анекдот? «Сапраўдная любоў — гэта калі ты памыў ката, а ён усё адно да цябе ідзе». Зычу кожнаму такога стартавага капіталу і няўхільнага яго памнажэння. Вядома, я не пра ката...

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Славянскія акцэнты» Гроса

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

***— Перад адборам на «Славянскі базар» у вас быў фінал нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне». Калі параўнаць два гэтыя перыяды, то які з іх патрабуе больш высілкаў?***

— Усюды неабходна напоўніцу выкладвацца, і ты адчуваеш вялікую адказнасць. Але з-за таго, што конкурсы адрозніваюцца, то і фарматы падрыхтоўкі зусім не падобныя. У любым выпадку патрабуецца грунтоўная праца над сабой. «Еўрабачанне» — гэта, перш за ўсё, падрыхтоўка канкрэтнай песні, плюс думаеш над нумарам, сцэнаграфіяй. А «Славянскі базар» — конкурс вакалістаў, і там ужо зусім іншыя акцэнты. Выбраць трэба тры творы, і пажадана, каб усе яны былі разнапланавымі, бо тады ёсць больш



Найлепшая магчымасць паказаць сябе для артыста — гэта сцэна.

магчымасцяў паказаць сябе. Напрыклад, сёлета, выбіраючы кампазіцыю на беларускай мове, мы аб'явілі конкурс, у рамках якога кожны мог прапанаваць сваю кампазіцыю. Атрымалі 72 пасланні з песнямі пра каханне, пра любоў да роднай зямлі. Аказваецца, у нас вельмі многія ў вольны час займаюцца музыкай. Нам здалася цікавай прапанова Таццяны Каваленкі з Гомеля, якая згадала пра кампазіцыю «Ой, дожджык ідзе». Спадабалася, што гэты матэрыял мала дзе гучаў. І мы вырашылі зрабіць сваю інтэрпрэтацыю. Падключылі да напісання аранжыроўкі Максіма Пугачова, потым запісалі жывыя інструменты, а вось у выкананні спрабавалі максімальна захаваць першапачатковую форму. Потым знайшлі песню Пятра Ялфімава «Я хачу» і пачалі працаваць над ёй. А замежным хітом будзе «Its my life» Бон Джові.

**«Перажываючы, што не змагу належным чынам клапаціцца пра новага сябра, думаў ёрка перадарыць некаму. А потым прывык і пачаў называць яго Гросікам-малодшым».**

***— Успамінаю вашу сёлетнюю відэавізітоўку на «Еўрабачанне», дзе вы прадстаяце ў вобразе каваля, якому пакараецца і метал, і агонь. Вас гэта характарызуе як артыста?***

— Мне складана ацэньваць самога сябе. Але здаецца, што я ўпарты і працавіты чалавек. І цалкам згодны з думкай, што артыст павінен быць кавалём свайго шчасця.

**«Я з тых артыстаў, якім не прывыкаць да няспыннага тэмпу ў працы, хоць цяпер ён значна паскорыўся. Перакананы ў адным: настойлівая праца заўсёды дае вынік».**

***— Падчас нашага першага інтэрв'ю тры гады таму вы ўспаміналі, што свае першыя апладысменты зарабілі на ўроку літаратуры. Як з той пары складваюцца вашы ўзаемаадносіны з кнігамі?***

— Часу чытаць цяпер, на жаль, няма. І ўвогуле жаданне ўзяць у рукі тую ці іншую кнігу ў мяне ўзнікае спантанна. Бо часцей усё ж ты вяртаешся дадому з чаргового канцэрта і марыш элементарна паспаць... Але ў свой час я пяць разоў перачытваў раман «Дванаццаць крэслаў». Таксама люблю іншым разам прачытаць нейкі твор, каб параўнаць яго з фільмам. Так, напрыклад, было, калі мне падарылі кнігу «Байцоўскі клуб».

***— Ваш малодшы брат таксама цікавіцца музыкай. Наколькі часта тэма творчасці прысутнічае ў вашых размовах?***

— Яны ў нашай сям'і вядуцца пастаянна, яшчэ з самага дзяцінства. Таму лагічна, што мой брат, як і я, вырашыў прафесійна займацца музыкай. Сёлета ён плануе паступаць у каледж імя Глінкі, дзе хоча вучыцца па класе «Эстрадна-джазавае фартэпіяна». Часам тэлефануе мне, каб параіцца. Нядаўна нават напісаў першую аранжыроўку да песні Рэя Чарльза «A Song for You», яе я планаваў выконваць на конкурсе ў Віцебску. Мой брат вельмі адказны і працавіты, і гэта пераконвае мяне ў тым, што ён абавязкова даб'ецца сваёй мэты. Што тычыцца маёй творчасці, то бывае, яго парады мне дапамагаюць. А месцамі можа нават і пакрытыкаваць мяне. Мы ў прынцыпе ўсёй сям'ёй абмяркоўваем нейкія моманты майго творчага жыцця, любім іграць разам, калі сустракаемся. Напрыклад, бацька, ён у мінулым таксама музыкант, год таму на дзень нараджэння падарыў мне гітару. Цяпер я вучуся іграць на гэтым інструменце, а пры сустрэчы мы можам і нейкую вакальна-інструментальную імправізацыю зладзіць.

**«Выбіраючы кампазіцыю на беларускай мове, мы аб'явілі конкурс, у рамках якога кожны мог прапанаваць сваю кампазіцыю. Атрымалі 72 пасланні з песнямі пра каханне, пра любоў да роднай зямлі».**

***— Дарэчы, што тычыцца падарункаў, то чым у гэтым плане здзіўляюць вас прыхільнікі?***

— У мяне два сабакі, аднаго з якіх мне падарыла паклонніца. Я адказны чалавек і спачатку, перажываючы, што не змагу належным чынам клапаціцца пра новага сябра, думаў ёрка перадарыць некаму. А потым прывык і пачаў называць яго Гросікам-малодшым. А ўвогуле падарункі бываюць самыя розныя. Хтосьці дасылае свае песні, іншыя — вершы. Дзяўчаты перыядычна прапануюць сустрэцца і пасябраваць. Але ж у мяне зусім няма на гэта часу...

***— А бацькі не намякаюць пра ўнукаў?***

— Бацькі і маці разумеюць, што я выбраў такі шлях, дзе спачатку мне хочацца нечага дасягнуць, а потым ужо думаць пра астатняе... Вось атрымаю Грэмі *(смяецца)*, і калі з'явіцца жаданне змяніць прыярытэты, то буду дзейнічаць у гэтым напрамку.

**Алена ДРАПКО.** *drapko@zviazda.by*



Поспехаў на «Славянскім базары» Аляксею пажадала пры сустрэчы спявачка Ані Лорак.

ЧЫРВОНКА. Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.023.
Нумар падпісаны ў 19.30 15.06.2016 г.

■ Рэха 41-га

# Невядомых салдат стане менш

## У Чавускім раёне пошукавікі падымаюць астанкі байцоў генерала Бакуніна

**Тут, на краі вялікага поля, успомнілася аднойчы ўбачаная ў музеі карціна. Ён і яна цесна абняўшыся, сядзяць на квітнеючым лузе, удалечыні віднеецца вёсачка, усё дыхае спакоем і радасцю. Карціну можна было б назваць ідыліяй, калі б толькі не хмурныя паніклыя салдаты, якія ідуць над імі ў небе. Вакол іх — калючы дрот і нібы адчуваецца подых смерці. Дзве рэальнасці сышліся ў адной кропцы і размінуліся ў часе. Зусім як каля вёсачкі з сімвалічнай назвай Благавічы. Сёння тут гучаць дзіцячыя галасы і мірна спее кукуруза, а 75 гадоў таму, у 1941-м, пасля прарыву абароны Магілёва, байцы 61-га стралковага корпуса пад камандаваннем генерала Фёдара Бакуніна рабілі адчайную спробу прабіцца да сваіх. На жаль, атрымалася ў нямногіх.**



Дзякуючы гэтым людзям, невядомых салдат становіцца менш. Сяргей ТАГАЕЎ (у цэнтры), за ім Валерый БЯЗРУЧАНКА, кіраўнік групы «Братэрства» з Чавус, і дырэктар філіяла ТАА «Музейныя тэхналогіі» Сяргей БЯСПАНСКІ.

### ПАХАВАННІ ВАЙНЫ

Сёння аб тых гарачых днях сведчаць салдацкія манументы. У 1998 годзе каля вёскі Самулкі Чавускага раёна быў усталяваны помнік у выглядзе гарматы і стэлы, які нагадвае пра тое, якая цана была заплачана за будучую Перамогу ў першыя дні вайны. Благавічы, Машок, Удоўск, Самулкі — на гэтай паласе працягласцю прыкладна 5 кіламетраў у ліпені 41-га ішлі жорсткія, не на жыццё, а на смерць баі. Менавіта тут 26, 27, 28 ліпеня ў сутычку з немцамі ўступілі байцы 61-га стралковага корпуса генерала Бакуніна. Злучэнне налічвала каля 9 тысяч чалавек, большая частка байцоў і камандзіраў або трапіла ў палон, або загінула. Сам Бакунін вывеў усяго 140 чалавек...

Аляксандр Ракаў, настаўнік фізкультуры Благавіцкай школы, летась, скарачаючы праз поле шлях у суседнюю вёску Забалоцце, наткнуўся на нечаканую знаходку. З зямлі тарчаў край салдацкай каскі. Пацягнуў на сябе, і з ямы паказаліся косткі. Ён хутка зразумеў, што гэта пахаванне часоў Вялікай Айчыннай. Не аднойчы чуў ад старажылаў, як шмат тут палягло нашых байцоў. Жыхары нават не паспявалі хаваць забітых.

— Тэма вайны вельмі балючая для мяне. Дзед прапаў без вестак у Брэсцкай крэпасці ў 41-м. Яшчэ адзін дайшоў да Берліна, яму пашчасціла вярнуцца дадому. Памёр у 1981 годзе. А вось Іван Лебедзеў, дзядзька маёй маці, які быў прызваны ў маі 41-га, таксама знік у нябыт, — не хавае Аляксандр свайго хвалявання.

Ён сустракае нас каля Благавіцкай школы. Побач стары храм 1904 года пабудовы і могілкі, дзе ёсць пахаванні ваенных часоў. Насупраць помнік студэнтам Магілёўскага педінстытута, якія ў ліпені 1941 года ў складзе 1-га камуністычнага знішчальнага батальёна стрымлівалі тут наступленне нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На граніцы імёны 12 студэнтаў-герояў. Помнік быў устаноўлены ў 2005 годзе на грошы выкладчыкаў і студэнтаў МДУ імя А. Куляшова.

Пошукавікі працуюць на тэрыторыі Чавускага раёна не першы год. Але зямля не вельмі ахвотна вяртае імёны палеглых тут сваіх сыноў. **Кіраўніку Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру» Мікалаю БАРЫСЕНКУ** пашчасціла знайсці ў Цэнтральным архіве Мінабароны Расіі схему з месцамі пахаванняў, якую склаў баец 61-га корпуса пасля выхаду з акружэння. Знойдзенае Аляксандрам месца якраз з іх ліку. Мікалай Барысенка лічыць, што на палях у раёне Благавіч такіх стыхійных магіл не менш, чым пяць.

### АПАНТАНЫЯ ЛЮДЗІ

Сяргей Тагаеў, сам цалкам захоплены пошукавай справай чалавек, можа заразіць любога. Ён камандзір пошукавага атрада «Рэха вайны», выкладчык электратэхнічнага каледжа, таму большасць навічкоў менавіта адтуль. Ёсць і школьнікі. Антон Кунакін — дзесяцікласнік, вучыцца ў 25-й магілёўскай школе. «Палеглым вяртаем імёны» — так называецца яго даследчая работа па абароне Магілёва, напісаная пад кіраўніцтвам настаўніка Юрыя Жыгадла. Яе мэта — знайсці сведак і перадаць паказанні пошукавікам для праверкі інфармацыі. Еўдакія Осіпава адна з іх, яна падказала месца пахавання трох чырвонаармейцаў. Па двух медальёнах, якія былі знойдзены на месцы пахавання, атрымалася ўстанавіць, што гэта былі два Мікалаі — Рахаеў і Таранец.

Антон Пракапнёў, студэнт 5 курса механічнага факультэта Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання, ужо вопытны пошукавік — займаецца гэтай справай 4 гады. У «Віккру» прыйшоў мэтанакіравана, на 1-м курсе ўніверсітэта захапіўся краязнаўствам і даведаўся, што ў Магілёве існуе такі клуб. Цяпер ён правая рука кіраўніка. «Цікава шукаць, займацца гісторыяй. Асабіста знаходзіў і прадметы амуніцыі, і астанкі байцоў. Не так даўно ў Сідаравічах было перапахаванне салдат, аднаго з іх я пры раскопках зачапіў за каску», — кажа ён. Менавіта дзякуючы Антону сталі вядомы прозвішчы больш трох тысяч савецкіх байцоў, захопленых у палон падчас абароны Магілёва. У свой вольны час ён шукае ў інтэрнэце спісы абаронцаў. Работа вельмі карпатлівая, улічваючы, што такіх байцоў тысячы. Спачатку шукаў па адным, а потым вырашыў звузіць кола і напісаў: месца, дзе трапілі ў палон — Магілёў, 1941—1942 гады. Абагульнены банк даных «Мемарыял» выдаў каля 7 тысяч картак ваеннапалонных. Але, як высветлілася, толькі 3 тысячы з іх трымалі абарону пад Магілёвам. Малады хлопец сур'ёзны не па гадах. На жаль, шмат яго равеснікаў нават не ведае пра сваіх гераічных дзядоў. Антон можа расказаць пра сваіх усё. Адзін з яго продкаў загінуў пры абароне Севастопаля. Знаёмы, які быў з ім у адным падраздзяленні, расказваў, што гэта адбылося, калі яны плылі на вялікіх лодках і іх пачалі бамбіць.

Кароткі інструктаж праводзіць Мікалай БАРЫСЕНКА, і — да справы.



### ТРАГІЧНЫ ЛЁС АБАРОНЦАЎ

У сваёй кнізе **«1941 год: палаючыя рубяжы Дняпра і Сожа»** Мікалай Барысенка, спасылаючыся на савецкія і нямецкія крыніцы, у дэталях перадае, як разгортваліся падзеі. Магілёў трымаўся 23 дні, вораг захопліваў суседнія населеныя пункты, а тут усё яшчэ аказвалі супраціўленне. Горад быў у катле, калі байцы былі вымушаны спыніць баі і выходзіць з акружэння. Каля 4 тысяч чалавек пад камандаваннем генерала Міхаіла Раманава адыходзіла ў напрамку Буйнічы — Брускі. Злучэнне генерала Бакуніна рабіла гэтую спробу праз Чавускі раён. У сваіх дзённікавых запісах Канстанцін Сіманаў занатаваў, што ў баях паміж Магілёвам і Чавусамі, каля вёскі Машок, пры выхадзе з акружэння загінуў камісар 61-га стралковага корпуса Іван Воранаў. Мікалай Барысенка даўно ўжо спадзяецца знайсці месца пахавання камісара. Можа, цяпер пашчасціць?

У камандзе ёсць пошукавікі з Мінска, Быхава, Чавус. Старшыня Дзмітрый Лагуценка прадстаўляе 52-і асобны спецыялізаваны батальён. Ён сочыць за тым, каб раскопкі вяліся па правілах. Барысенка на правах галоўнага ўводзіць усіх у курс справы і праводзіць невялічкі інструктаж.

— Нікому не забываецца, што гэта месца былых баявых дзеянняў. Абавязкова пры любой сумніўнай знаходцы выклікаць старшага. Самім нічога не рабіць — гэтыя словы больш датычацца маладых, якія пошукавай справай займаюцца ўпершыню.

Тут дагэтуль знаходзяць фрагменты гранат, снарадаў, мін — усяго смертаноснага, што засталося пасля трох дзён жорсткіх баёў. Тут ляжыць больш за 2000 савецкіх салдат. За апошнія 20 гадоў ад Самулак да Благавіч пошукавікі знайшлі каля тысячы. Так што працы яшчэ хопіць надоўга.

У сёлетнім сезоне гэта першыя раскопкі. Яны даюць старт чарговай абласной вахце памяці, якая працягнецца да кастрычніка. Самае каштоўнае, вядома, медальёны — яны дапамогуць устанавіць імёны тых, хто загінуў. Гэта тое, дзеля чаго ўласна і працуюць пошукавікі. Іх работа, лічы, ювелірная. Бо, каб не прапусціць маленькую металічную або пластмасавую капсулу, трэба ўвесь час напружана ўглядацца ў зямлю. А потым яшчэ кожны яе сантыметр пераціраць пальцамі. Справа вельмі адказная, таму капаюць людзі выключна вопытныя. Яны бачаць тое, што не відаць нам. Вось і зараз Сяргей Тагаеў робіць выснову, што ў яме ляжаць зусім маладыя хлопцы, якім падчас пахавання было каля 20. Падлеткі ў форме «Віккру» перабіраюць пальцамі выкінутую наверх зямлю. Асобна складаюцца астанкі. Яны будуць перапахаваны каля брацкіх магіл, калі скончацца пошукавыя работы.

Пахаванне стыхійнае, аб гэтым сведчаць наспех кінутыя паверх забітых вінтоўкі. Асобна ляжаць каскі. На адной з іх тры кулявыя прабоіны. Некалькі гадзін бесперапыннай працы — і падняты астанкі 9 байцоў. На працягу 3 дзён у трох розных пахаваннях каля Благавіч знойдзены астанкі яшчэ 11. У пяцярых з іх аказаліся медальёны ўзору 1925 і 1939 гадоў. А гэта значыць ёсць надзея, што невядомых стане менш. Медальёны перададзены на экспертызу. Цяпер усе спадзяванні на яе. А пошукі працягваюцца.



Першыя знаходкі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Экслібрыс «Звязды»

# ПА СТАРОНКАХ УСПАМІНАЎ

***Барыс Сачанка. Пад сузор'ем сярпа і молата. — Мінск: Кнігазбор, 2016. — 548 с.***




Пісьменнік Барыс Сачанка — з кагорты тых, каго не трэба адмыслова прадстаўляць чытачу. Яго ведаюць, любяць і цэняць пакаленні беларусаў. Яго раманы, апавяданні, пераклады, кнігі крытыкі і эсэістыкі шмат гадоў застаюцца прыкладамі творчасці чалавека, які валодаў неверагодным талентам, густам, выдатным пачуццём гумару. Аўтару, яркаму прадстаўніку пакалення шасцідзясятнікаў, сёлета магло б споўніцца 80... І як напамін пра яго асобу — новая кніга аповесцяў, апавяданняў, запісаў розных гадоў.

Доўгім быў шлях гэтага выдання да чытача. Укладальнікам зборніка прозы «Пад сузор'ем сярпа і молата» выступіў сам Барыс Сачанка. Кніга мусіла пабачыць свет яшчэ ў 1990-х, але, на жаль, аўтар так і не змог патрымаць яе ў руках... Тым не менш яе змест з адлегласці часу не стаў драбнейшым і менш значным, хутчэй наадварот — праз прызму гадоў ярчэй бачацца падзеі тых часоў, больш велічнай паўстае і сама постаць Барыса Сачанкі.

У новую кнігу класіка ўвайшлі розныя па жанры і змесце тэксты. Гэта і публіцыстычныя артыкулы, інтэрв'ю (дарэчы, ёсць тут і гутарка з Барысам Сачанкам, якая некалі друкавалася ў «Звяздзе»), аўтабіяграфічныя апавяданні і нататкі пад агульнай назвай «Восень у Парыжы», зробленыя ў той час, калі пісьменнік прадстаўляў Беларусь у ЮНЕСКА, дзе працаваў у Камісіі па культуры.

Крыху асобна стаіць аповесць «Засталіся толькі ўспаміны...», якую аўтар прысвяціў памяці сваёй маці Веры Сачанкі. Але мне падаецца, што менавіта гэты твор — цэнтральны, менавіта вакол яго гуртуюцца ўсе астатнія тэксты. Ён — ключ да разумення шляху пісьменніка, бо дзяцінства, ды і сама постаць маці, з'яўляецца скрыжаваннем, з якога пачынаюцца многія жыццёвыя шляхі-дарогі. Праз лёс простай жанчыны тут адлюстраваны лёс цэлага пакалення беларусаў. Жыццё ў вялікай вёсцы на Палессі, будаўніцтва ўласнай гаспадаркі, калектывізацыя з яе разбуральнымі наступствамі, Вялікая Айчынная вайна і праца ў Германіі, вяртанне на радзіму, дзе замест роднай хаты — толькі папялішча...

Зноў вёска, зноў вайна, зноў Чарнобыль, можа скрушна ўздыхнуць чытач. Так, але колькі жыцця, колькі настальгіі, смутку па маці ў гэтым аповедзе Барыса Сачанкі, колькі надзей на лепшае шчаслівае жыццё ў Вялікім Бары, што на Хойнічыне, колькі старанняў працы! Гэты твор зусім не нудны, ён чытаецца як сапраўдны блокбастар. На лёс простай беларускай сям'і, як і ўсяго пакалення, выпала столькі падзей, што нават уявіць складана. Пагрозы высылкі ў Сібір з-за адмовы ўдзельнічаць у калектывізацыі, рызыка смерці падчас вайны, цяжкая, амаль непасільная праца ў Германіі, вызваленне дзякуючы амерыканцам і зноў — «ганаровае» званне ворага і новыя пагрозы высылкі.

Тым не менш, насуперак усім нястачам, Барыс Сачанка здолеў развіць свой пісьменніцкі талент. Нягледзячы на перашкоды з боку «добразычліўцаў», ён, выхадзец з простай палескай вёскі, са шматдзетнай сям'і, хлопец, чый бацька нарыхтоўваў бяросту, змог паступіць ва ўніверсітэт у сталіцу, на аддзяленне журналістыкі. Пасля атрымання дыплома працаваў у часопісах «Вожык», «Полымя», стаў паважаным чалавекам і нават прадстаўляў краіну на міжнароднай арэне. Чым не «амерыканская мара» па-беларуску? Чым не доказ неверагоднай моцы духу і стараннасці ўсяго пакалення шасцідзясятнікаў? Бо прыклад Барыса Сачанкі — не адзіны ў беларускай літаратуры гэтага перыяду.

Сем'і, якія апынуліся на прымусовай працы ў Германіі і ў апошнія дні вайны былі вызваленыя амерыканцамі, атрымалі магчымасць не вяртацца на папялішчы родных хат, а паспрабаваць пабудаваць жыццё ў Новым Свеце — у Амерыцы. Нямногія скарысталіся гэтым шанцам, але на радзіме іх сталі лічыць здраднікамі і ворагамі. Лёс склаўся так, што менавіта Барыс Сачанка, чыё дзяцінства і юнацтва таксама было адзначана кляймом «быў у Германіі», стаў адным з першых журналістаў, даследчыкаў літаратуры, хто пачаў гучна казаць і пісаць пра здабыткі творцаў, якія жылі ў эміграцыі.

Думаецца, кніга Барыса Сачанкі зойме важнае месца на паліцах бібліятэк беларусаў. Для кагосьці яна адкрые новыя рысы ўжо знаёмай постаці творцы, а для некага стане першым крокам для доўгага сяброўства. Яно, безумоўна, будзе доўгім, бо гэты творца — настолькі таленавіты апавядальнік, што нельга не захапіцца яго майстэрствам.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

# РУП «Институт недвижимости и оценки»

## извещает о повторном открытом аукционе по продаже апартаментов и гаражных боксов в г. Сочи, находящихся в собственности Республики Беларусь и принадлежащих ГУ «Санаторий «Беларусь» на праве оперативного управления

| № лота | Описание лотов | Начальная цена с НДС, рос. руб. | Задаток, рос. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Апартамент № 201 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1528. Назначение - нежилое. Этаж – 2. Площадь – 172,4 кв.м | 24 289 290 | 2 428 929 |
| Лот № 2 | Апартамент № 203 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1546. Назначение - нежилое. Этаж – 2. Площадь – 103,1 кв.м | 14 830 324 | 1 483 032,40 |
| Лот № 3 | Апартамент № 204 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1547. Назначение - нежилое. Этаж – 2. Площадь – 69,4 кв.м | 9 818 936 | 981 893,60 |
| Лот № 4 | Апартамент № 205 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1530. Назначение - нежилое. Этаж – 2. Площадь – 116,7 кв.м | 16 786 304 | 1 678 630,40 |
| Лот № 5 | Апартамент № 206 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1531. Назначение - нежилое. Этаж – 2. Площадь – 98,7 кв.м | 14 197 124 | 1 419 712,40 |
| Лот № 6 | Апартамент № 208 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1533. Назначение - нежилое. Этаж – 2. Площадь – 172,9 кв.м | 25 102 475 | 2 510 247,50 |
| Лот № 7 | Апартамент № 301 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1630. Назначение - нежилое. Этаж – 3. Площадь – 172,4 кв.м | 24 289 290 | 2 428 929 |
| Лот № 8 | Апартамент № 302 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1636. Назначение - нежилое. Этаж – 3. Площадь – 170,9 кв.м | 24 076 778 | 2 407 677,80 |
| Лот № 9 | Апартамент № 303 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1634. Назначение - нежилое. Этаж – 3. Площадь – 103,1 кв.м | 14 830 324 | 1 483 032,40 |
| Лот № 10 | Апартамент № 310 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1538. Назначение - нежилое. Этаж – 3. Площадь – 97,7 кв.м | 14 567 936 | 1 456 793,60 |
| Лот № 11 | Апартамент № 311 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1541. Назначение - нежилое. Этаж – 3. Площадь – 123,3 кв.м | 18 384 483 | 1 838 443,30 |
| Лот № 12 | Апартамент № 401 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1540. Назначение - нежилое. Этаж – 4. Площадь – 172,4 кв.м | 24 289 290 | 2 428 929 |
| Лот № 13 | Апартамент № 402 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1536. Назначение - нежилое. Этаж – 4. Площадь – 170,9 кв.м | 24 076 778 | 2 407 677,80 |
| Лот № 14 | Апартамент № 403 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1537. Назначение - нежилое. Этаж – 4. Площадь – 103,1 кв.м | 15 372 447 | 1 537 244,70 |
| Лот № 15 | Апартамент № 409 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1569. Назначение - нежилое. Этаж – 4. Площадь – 60,6 кв.м | 9 213 927 | 921 392,70 |
| Лот № 16 | Апартамент № 411 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1572. Назначение - нежилое. Этаж – 4. Площадь – 123,3 кв.м | 18 384 483 | 1 838 448,30 |
| Лот № 17 | Апартамент № 501 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1564. Назначение - нежилое. Этаж – 5. Площадь – 172,4 кв.м | 24 289 290 | 2 428 929 |
| Лот № 18 | Апартамент № 502 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1565. Назначение - нежилое. Этаж – 5. Площадь – 170,9 кв.м | 24 076 778 | 2 407 677,80 |
| Лот № 19 | Апартамент № 510 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1567. Назначение - нежилое. Этаж – 5. Площадь – 97,7 кв.м | 14 567 936 | 1 456 793,60 |
| Лот № 20 | Апартамент № 511 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1571. Назначение - нежилое. Этаж – 5. Площадь – 123,3 кв.м | 18 384 483 | 1 838 448,30 |
| Лот № 21 | Апартамент № 601 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1573. Назначение - нежилое. Этаж – 6. Площадь – 172,4 кв.м | 24 289 290 | 2 428 929 |
| Лот № 22 | Апартамент № 602 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1576. Назначение - нежилое. Этаж – 6. Площадь – 170,9 кв.м | 24 076 778 | 2 407 677,60 |
| Лот № 23 | Апартамент № 610 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1558. Назначение - нежилое. Этаж – 6. Площадь – 97,7 кв.м | 14 567 936 | 1 456 793,60 |
| Лот № 24 | Апартамент № 611 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1594. Назначение - нежилое. Этаж – 6. Площадь – 123,3 кв.м | 18 384 483 | 1 838 448,30 |
| Лот № 25 | Апартамент № 701 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1595. Назначение - нежилое. Этаж – 7. Площадь – 172,4 кв.м | 24 289 290 | 2 428 929 |
| Лот № 26 | Апартамент № 702 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1583. Назначение - нежилое. Этаж – 7. Площадь – 170,9 кв.м | 24 076 778 | 2 407 677,80 |
| Лот № 27 | Апартамент № 710 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1580. Назначение - нежилое. Этаж – 7. Площадь – 97,7 кв.м | 14 567 936 | 1 456 793,60 |
| Лот № 28 | Апартамент № 711 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1575. Назначение - нежилое. Этаж – 7. Площадь – 123,3 кв.м | 18 384 483 | 1 838 448,30 |
| Лот № 29 | Апартамент № 801 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1574. Назначение - нежилое. Этаж – 8. Площадь – 172,4 кв.м | 24 289 290 | 2 428 929 |
| Лот № 30 | Апартамент № 802 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1600. Назначение - нежилое. Этаж – 8. Площадь – 170,9 кв.м | 24 076 778 | 2 407 677,80 |
| Лот № 31 | Апартамент № 810 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1610. Назначение - нежилое. Этаж – 8. Площадь – 97,7 кв.м | 14 567 936 | 1 456 793,60 |
| Лот № 32 | Апартамент № 811 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1611. Назначение - нежилое. Этаж – 8. Площадь – 123,3 кв.м | 18 384 483 | 1 838 448,30 |
| Лот № 33 | Апартамент № 901 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1612. Назначение - нежилое. Этаж – 9. Площадь – 172,4 кв.м | 24 289 290 | 2 428 929 |
| Лот № 34 | Апартамент № 902 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1638. Назначение - нежилое. Этаж – 9. Площадь – 170,9 кв.м | 24 076 778 | 2 407 677,80 |
| Лот № 35 | Апартамент № 904 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1643. Назначение - нежилое. Этаж – 9. Площадь – 69,4 кв.м | 10 551 887 | 1 055 188,70 |
| Лот № 36 | Апартамент № 908 (5-ти комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1648. Назначение - нежилое. Этаж – 9,10. Площадь – 351 кв.м | 50 159 411 | 5 015 941,10 |
| Лот № 37 | Апартамент № 911 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1657. Назначение - нежилое. Этаж – 9. Площадь – 123,3 кв.м | 18 384 483 | 1 838 448,30 |
| Лот № 38 | Апартамент № 1001 (5-ти комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1659. Назначение - нежилое. Этаж – 10,11. Площадь – 347,7 кв.м | 48 042 962 | 4 804 296,20 |
| Лот № 39 | Апартамент № 1002 (5-ти комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1651. Назначение - нежилое. Этаж – 10,11. Площадь – 344 кв.м | 47 531 198 | 4 753 119,80 |
| Лот № 40 | Гаражный бокс № 9 с кадастровым номером 23:49:0203004:1602. Назначение - нежилое. Этаж – Подвал № -3. Площадь – 14,7 кв.м | 1 400 846 | 140 084,60 |
| Лот № 41 | Гаражный бокс № 10 с кадастровым номером 23:49:0203004:1603. Назначение - нежилое. Этаж – Подвал № -3. Площадь – 12,7 кв.м | 1 314 107 | 131 410,70 |
| Лот № 42 | Гаражный бокс № 11 с кадастровым номером 23:49:0203004:1607. Назначение - нежилое. Этаж – Подвал № -3. Площадь – 13,4 кв.м | 1 344 466 | 134 446,60 |
| Лот № 43 | Гаражный бокс № 12 с кадастровым номером 23:49:0203004:1598. Назначение - нежилое. Этаж – Подвал № -3. Площадь – 11,3 кв.м | 1 253 389 | 125 338,90 |
| Лот № 44 | Гаражный бокс № 13 с кадастровым номером 23:49:0203004:1604. Назначение - нежилое. Этаж – Подвал № -3. Площадь – 14,9 кв.м | 1 409 520 | 140 952 |
| Лот № 45 | Гаражный бокс № 14 с кадастровым номером 23:49:0203004:1605. Назначение - нежилое. Этаж – Подвал № -3. Площадь – 12,5 кв.м | 1 305 433 | 130 543,30 |
| Лот № 46 | Гаражный бокс № 15 с кадастровым номером 23:49:0203004:1608. Назначение - нежилое. Этаж – Подвал № -3. Площадь – 12,5 кв.м | 1 305 433 | 130 543,30 |
| Лот № 47 | Гаражный бокс № 16 с кадастровым номером 23:49:0203004:1606. Назначение - нежилое. Этаж – Подвал № -3. Площадь – 13,1 кв.м | 1 331 455 | 133 145,50 |
| Лот № 48 | Гаражный бокс № 17 с кадастровым номером 23:49:0203004:1614. Назначение - нежилое. Этаж – Подвал № -3. Площадь – 11,7 кв.м | 1 270 737 | 127 073,70 |
| Лот № 49 | Гаражный бокс № 18 с кадастровым номером 23:49:0203004:1609. Назначение - нежилое. Этаж – Подвал № -3. Площадь – 13,5 кв.м | 1 348 803 | 134 880,30 |
| Лот № 50 | Гаражный бокс № 19 с кадастровым номером 23:49:0203004:1617. Назначение - нежилое. Этаж – Подвал № -3. Площадь – 12,1 кв.м | 1 288 085 | 128 808,50 |
| Лот № 51 | Гаражный бокс № 20 с кадастровым номером 23:49:0203004:1562. Назначение - нежилое. Этаж – Подвал № -3. Площадь – 13,0 кв.м | 1 327 118 | 132 711,80 |
| Лот № 52 | Гаражный бокс № 21 с кадастровым номером 23:49:0203004:1561. Назначение - нежилое. Этаж – Подвал № -3. Площадь – 12,5 кв.м | 1 305 433 | 130 543,30 |
| Лот № 53 | Гаражный бокс № 22 с кадастровым номером 23:49:0203004:1563. Назначение - нежилое. Этаж – Подвал № -3. Площадь – 13,0 кв.м | 1 327 118 | 132 711,80 |
| Лот № 54 | Гаражный бокс № 23 с кадастровым номером 23:49:0203004:1653. Назначение - нежилое. Этаж – Подвал № -3. Площадь – 14,3 кв.м | 1 383 499 | 138 349,90 |
| Лот № 55 | Гаражный бокс № 24 с кадастровым номером 23:49:0203004:1676. Назначение - нежилое. Этаж – Подвал № -3. Площадь – 15,9 кв.м | 1 452 890 | 145 289 |
| Лот № 56 | Гаражный бокс № 25 с кадастровым номером 23:49:0203004:1655. Назначение - нежилое. Этаж – Подвал № -3. Площадь – 12,4 кв.м | 1 301 096 | 130 109,60 |
| Лот № 57 | Гаражный бокс № 26 с кадастровым номером 23:49:0203004:1656. Назначение - нежилое. Этаж – Подвал № -3. Площадь – 12,8 кв.м | 1 318 444 | 131 844,40 |
| Лот № 58 | Гаражный бокс № 27 с кадастровым номером 23:49:0203004:1677. Назначение - нежилое. Этаж – Подвал № -3. Площадь – 12,1 кв.м | 1 288 085 | 128 808,50 |
| Лот № 59 | Гаражный бокс № 28 с кадастровым номером 23:49:0203004:1678. Назначение - нежилое. Этаж – Подвал № -3. Площадь – 13,7 кв.м | 1 357 477 | 135 747,70 |
| Лот № 60 | Гаражный бокс № 29 с кадастровым номером 23:49:0203004:1679. Назначение - нежилое. Этаж – Подвал № -3. Площадь – 13,7 кв.м | 1 357 477 | 135 747,70 |
| Лот № 61 | Гаражный бокс № 30 с кадастровым номером 23:49:0203004:1680. Назначение - нежилое. Этаж – Подвал № -3. Площадь – 13,4 кв.м | 1 344 466 | 134 446,60 |
| Лот № 62 | Гаражный бокс № 31 с кадастровым номером 23:49:0203004:1681. Назначение - нежилое. Этаж – Подвал № -3. Площадь – 13,0 кв.м | 1 327 118 | 132 711,80 |
| Лот № 63 | Гаражный бокс № 32 с кадастровым номером 23:49:0203004:1675. Назначение - нежилое. Этаж – Подвал № -3. Площадь – 13,5 кв.м | 1 348 803 | 134 880,30 |
| Лот № 64 | Гаражный бокс № 43 с кадастровым номером 23:49:0203004:1667. Назначение - нежилое. Цокольный этаж № -2. Площадь – 11,7 кв.м | 1 270 737 | 127 073,70 |
| Лот № 65 | Гаражный бокс № 45 с кадастровым номером 23:49:0203004:1631. Назначение - нежилое. Цокольный этаж № -2. Площадь – 12,5 кв.м | 1 305 433 | 130 543,30 |
| Лот № 66 | Гаражный бокс № 46 с кадастровым номером 23:49:0203004:1627. Назначение - нежилое. Цокольный этаж № -2. Площадь – 13,5 кв.м | 1 348 803 | 134 880,30 |

### ОПИСАНИЕ АПАРТОТЕЛЯ

Апартаменты и гаражные боксы находятся в здании апартотеля, представляющего собой монолитное 13-этажное здание (введено в эксплуатацию в апреле 2015 г.), расположенного по адресу: г. Сочи, ул. Политехническая, д. 62, в одном из самых экологически чистых районов, на круглосуточно охраняемой территории Государственного учреждения «Санаторий «Беларусь» в непосредственной близости от государственной дачи «Бочаров ручей». Апартотель расположен на земельном участке с кадастровым № 23:49:0203004:21 площадью 155 600 кв.м, предоставленном Государственному учреждению «Санаторий «Беларусь» на праве аренды по 22.09.2062. Разрешенное использование земельного участка – для размещения и эксплуатации зданий и сооружений санатория.

### УСЛОВИЯ

К участию в аукционных торгах допускаются индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица без ограничения, вне зависимости от государственной принадлежности, внесшие задаток по 22.06.2016. В качестве участника аукциона регистрируются лица, задаток которых поступил на расчетный счет Организатора аукциона на момент подачи заявления на участие в аукционе с иными необходимыми документами.

Валюта торгов – российский рубль. Валюта платежа — российский рубль.

Задаток за участие в аукционных торгах устанавливается в российских рублях. Сумма для оплаты задатка за участие в аукционе для резидентов Республики Беларусь производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан подписать договор купли-продажи Объекта (Объектов) с Продавцом в течение 5 (пяти) дней с назначенной даты аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) в течение 30 (тридцати) дней с назначенной даты аукциона.

Передача Победителю аукциона (Претенденту на покупку) пакета документов для регистрации (оформления) права собственности осуществляется только после оплаты полной стоимости Объекта (Объектов).

Государственная регистрация договора купли-продажи Объекта (Объектов) осуществляется Победителем аукциона (Претендентом на покупку) после полной оплаты стоимости приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) и получения перечисленной суммы Продавцом.

Все расходы по удостоверению, составлению и оформлению договора купли-продажи, уплате государственной пошлины оплачиваются Победителем аукциона (Претендентом на покупку).

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение повторного открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Запрет на изменение фасадной части.

Платежи и расчеты с резидентами и нерезидентами Республики Беларусь осуществляются в соответствии с законодательством Республики Беларусь, регулирующим расчеты при проведении валютных операций.

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его Победителем (Претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №609 и соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона, составляет 5% от стоимости Объекта (Объектов).

**Аукцион состоится 29.06.2016 в 14.00 по мск по адресу: Российская Федерация, Краснодарский край, г. Сочи, ул. Политехническая, 62, конгресс-зал главного корпуса. Шаг аукциона – 5%.**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток для резидентов Республики Беларусь перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369.

Задаток для нерезидентов Республики Беларусь перечисляется на текущий счет в российских рублях 3012232138035, код 739, в ОАО «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», 220002 г. Минск, пр. Машерова, 29. ОКПО 37492021. ПАО «Сбербанк России» г. Москва, ИНН 7707083893, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО, счет 30111810800000000154. SWIFT код SABRRUMM. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов.

Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже апартаментов и гаражных боксов (Лот №__), проводимом 29 июня 2016 г.

Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь, оформление и регистрация сделки в соответствии с законодательством Российской Федерации.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются:

